PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl
niva_bielastok@skrzynka.pl

№ 37 (2418) Год XLVII | Беласток, 15 верасня 2002 г. | Цана 2,00 зл.

Люд хоча ў Расію

Яўген Мірановіч

Беларусь магла б быць даволі атракцыйнай краінай для турызму, асабліва суседнім народам. Чыстыя азёры на поўначы краіны, ціхія мястэчкі на Панямонні ці маляўнічыя краявіды над Прыпяццю маглі б задаволіць шмат якіх замежнікаў. Але перш за ўсё цана паслуг у беларускіх курортах несумненна найніжэйшая ў Еўропе. У гродзенскім курорце над самым Нёманам за 21 дзень разам з кватэрай, харчаваннем і лячэбнымі паслугамі патрабуюць толькі 150 долараў — утрая менш чым у Польшчы.

Аднак у Беларусь адпачываць ніхто ехаць не збіраецца. Сродкі масавай інфармацыі стварылі міф аб гэтай краіне, як надта беднай, бруднай, з разбітымі дарогамі і карумпаванымі міліцыянерамі. Хаця шмат абсурдаў выступае ў краіне, аднак няшмат там можна сустрэць з таго, аб чым можна прачытаць у варшаўскіх ці беластоцкіх газетах.

Савецкі люд хоча жыць у Расіі

Найбольшай асаблівасцю краіны з'яўляецца несумненна сам прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, герой большасці жартаў і народнай сатыры. Заўсёды выступае ён у падобнай ролі як міліцыянер пры Народнай Польшчы. Аднак — падказваюць мясцовыя інтэлектуалы — дастаткова паглядзець тэлепраграмы з удзелам прэзідэнта, каб быць удзельнікам спектакля чорнага гумару. Апошнім часам для прыхільнікаў інтэграцыі з Расіяй, сваіх найбольшых паклоннікаў стаў ён здраднікам ідэі яднання. Савецкі па менталітэце люд хоча жыць у Расіі. „А мне там всё равно в какой краине жить будем. Пусть долучают нас к России, Германии или Польши, только чтоб деньги за работу я получал", — гаварыў шафёр аўтобуса, які зведаў за рулём палову Еўропы. „А мне там всё равно кто будет с нами вместе — руский, белорус, поляк или еврей. Важное, чтобы человек был хорошим другом", — прагучала філасофія прадстаўніка беларускага люду.

Сотні гадоў эліты Беларусі будавалі „вместе с хорошими друзьями" палітычны лад свае краіны — Вялікае княства Літоўскае, Рэч Паспалітую, Расійскую імперыю, Савецкі Саюз. Заўсёды былі „с кем то вместе". Сёння адны гісторыкі і літаратары хваляць Вялікае княства і Рэч Паспалітую, другія — Расію і Савецкі Саюз, як патрачаны рай на беларускай зямлі. І ніхто не звятрае нават увагі як жылося звычайным беларусам у райскіх эпохах. На пальцах рук можна палічыць інтэлектуалаў, якія прабуюць думаць катэгорыямі аўтаномнай Беларусі. Люд тутэйшы хоча ін-

[працяг ☞ 2]

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

Яшчэ без падручнікаў

Аляксей Мароз

Адкрыццё новага навучальнага года ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы у Гайнаўцы, якое адбылося 2 верасня, падзелена было на дзве часткі. Спачатку дырэктар Яўген Сачко і настаўнікі спаткаліся з белгімназістамі, а пасля з белліцэістамі. Зараз у комплексе школ пачынае вучобу 570 вучняў і цяжка было б ім памясціцца ў невялікай актавай зале. Спатканне з белліцэістамі было больш урачыстым, бо распачалося з увядзення школьнага сцяга. У час сустрэчы са старэйшымі вучнямі прысутны былі намеснік старасты Ежы Сірак і свяшчэннікі гайнаўскіх прыходаў. Настаўніца Вольга Сянкевіч падрыхтавала ўсім вучням праграмы навучання па беларускай мове.

З гэтага года ліцэісты з першых класаў распачынаюць вучобу ў трохгадовым ліцэі з дадатковым навучаннем беларускай мовы. Новаспечаныя белліцэісты будуць вучыцца ў чатырох класах з пашыраным навучаннем выбраных прадметаў. Яшчэ раней вучні рашыліся на пашыраную вучобу матэматыкі і фізікі (клас „а"), біялогіі і хіміі („б"), польскай мовы, гісторыі і ведаў аб культуры („ц") і рускай мовы, геаграфіі і прадпрымальніцтва („д"). Аўтарская праграма Вольгі Сянкевіч прадбачвае падрыхтоўку ліцэістаў да новай матуры па беларускай мове з асаблівым улікам умеласці вучняў. Настаўнікі беларускай мовы будуць больш працаваць з тэкстамі, правяраць іх разуменне і звяртаць асаблівую ўвагу на правільнае вымаўленне. У час урокаў будуць апрацоўваць больш публіцыстычных тэкстаў і артыкулаў аб мастацтве. Часцей будуць карыстацца беларускамоўнымі перадачамі па радыё і тэлебачанні. На жаль, не выйшлі яшчэ з друку падручнікі па беларускай мове для ліцэяў аўтарства Вольгі Сянкевіч, Іаланты Грыгарук і Яна Карчэўскага. Затое з'явіўся ўжо падручнік Яўгена Мірановіча па гісторыі Беларусі. Вучні будуць таксама карыстацца старымі падручнікамі прывезенымі з Беларусі, новай хрэстаматыяй для вучняў ліцэяў, падрыхтаванай Вольгай Сянкевіч і Іалантай Грыгарук, „Нівай" і „Часопісам". Выдадзены ўжо падручнікі да першага і другога класаў белгімназіі аўтарства метадыста беларускай мовы Тамары Русачык і яе сааўтарства хрэстаматыя для вучняў гімназій. Аднак, у Гайнаўскай белгімназіі сярод першакласнікаў многа вучняў, якія не вучыліся беларускай мове ў падставовых школах.

— Першы год стараемся, каб вучні, якія не вучыліся беларускай мове ў падставовых школах, дастасаваліся да праграмы навучання для гімназій. Карыстаемся тады толькі выбранымі тэкстамі з падручнікаў да першых класаў, уласнымі тэкстамі і артыкуламі з „Зоркі" і „Нівы", — заявіла настаўніца Вольга Сянкевіч.

Толькі ў канцы жніўня высветлілася, што Гайнаўскае староства, якое непасрэдна фінансуе белліцэй, будзе перадаваць грошы на арганізаванне навучання беларускай мовы ў белліцэі размерам чаторох гадзін у тыдзень. Зараз Міністэрства адукацыі прадбачвае фінансаванне навучання роднай мовы для нацыянальных меншасцей размерам трох гадзін у тыдзень. Чацвёртая гадзіна будзе аплачвацца са сродкаў староства. У белгімназіі, як і раней, вучні будуць вучыцца беларускай мове тры гадзіны ў тыдні.

[працяг ☞ 3]

Новыя рэаліі беларускай адукацыі ☞ 2

З гэтай восені практычна ўсе школы ў Беларусі распачнуць ужываць так званую „пяцідзёнку". Гэта значыць, што на заняткі вучні сярэдніх школ будуць хадзіць толькі 5 дзён на тыдзень. Дыскусіі аб пераходзе на такую форму навучання праходзілі ўжо даволі доўгі час. Адным з асноўных аргументаў неабходнасці новаўвядзення лічыцца надзвычайная загружанасць вучняў.

Вялікая палітыка і тэрарысты ☞ 4

Вайна супраць Сербіі паказала адназначна, што можна ў сучасным свеце зусім бяскарна напасці на любую краіну, а прапаганда і вялікія аўтарытэты пераканаюць сусветнае грамадства, што нават забітыя дзеці былі пагрозай для міру і дэмакратыі. Тэрор супраць сербаў быў вынікам рашэння праўлення дэмакратычных краін, а інтэлектуальныя эліты, за невялікімі выключэннямі, апраўдалі злачынства.

Ідзем самастойна ☞ 4

Плануем выставіць максімальную колькасць кандыдатаў на радных Гайнаўскага павета, 16 кандыдатаў з горада і 18 кандыдатаў з трох вясковых округ. Намерваемся паставіць максімальную колькасць кандыдатаў у выбарах да Рады горада Гайнаўкі — у 3 округах па 14 асоб.

Ля калыскі Якуба Коласа ☞ 5

Дом у Акінчыцах стаіць у сімвалічным месцы. Ля старажытнага гасцінца „Кацярынка". Дарога, названая ў гонар рускай імператрыцы, спалучала Пецярбург, Варшаву, Берлін, Парыж і Ватыкан. Бацька Коласа, пакуль стаў лесніком, пільнаваў гэту дарогу, браў мыта за карыстанне шляхам.

Дажынкі ў Чыжах ☞ 8

Мясцовыя хоры „Чыжавяне" і „Збучанкі" з прыгожымі дажынкавымі вянкамі спяшаліся ў мясцовую царкву Успення Божай Маці. Цудоўна спяваў прыхадскі хор, настаяцель прыхода айцец Іаан Раманчук пасвяціў дажынкавыя вянкі і ў пропаведзі на прыгожай беларускай мове шчыра падзякаваў сялянам за іх працу пры ўборцы ўраджаю.

Чырвоная Армія ☞ 10

Невялікі атрад Чырвонай Арміі затрымаўся таксама і ў маёй вёсцы Мора дзеля „ўтрымання парадку". Салдат размеркавалі па хатах. У нас пасяліўся сімпатычны чырвонаармеец, які ўпадабаў сабе нашу вялікую хлебную печ, з якой высяліў мяне з братам.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Люд хоча ў Расію

[1 ☞ працяг]

тэгравацца абы з кім, каб толькі „получать зарплату”. Люд хоча служыць і выконваць загады, а нацыянальныя ідэі, якіх дзесяткамі гадоў шукае савецкая і постсавецкая інтэлігенцыя, цікавяць яго столькі, што мінулагодні снег.

Пацёмкінская вёска

1 верасня ў мястэчку Мір адбыліся агульнадзяржаўныя святкаванні пад назвай „Дні беларускага пісьменства”. Пад славуты Мірскі замак (на здымку) прыехалі дзесяткі тысяч гасцей з усяе Беларусі. На галоўнай сцэне прамаўлялі прадстаўнікі прэзідэнта і ўрада, мітрапаліт Філарэт, выступалі народныя паэты. Побач амонаўцаў найважнейшых гасцей ахоўвала гвардыя ва уніформах з эпохі імператара Аляксандра I. Вакол замка праходзіла некалькі фэстаў у бэгэкатоўскім стылі. Увесь гарадок гучаў ад спеваў і танцаў. Паміж дрэвамі пякліся над агнём парасяты, казлы, цяляты і традыцыйныя шашлыкі. Прыгажуні ў вышываных вопратках прапанавалі булачкі, хлеб і ласункі з усіх рэгіёнаў Беларусі. Дзень быў спякотны, таму людзі выпілі возера піва і ўсялякай салодкай вады. Прадаваліся творы народнага мастацтва — вырабы з саломы, вышыванкі і маляванкі. Можна было набыць кніжкі на беларускай мове, нават пераклады твораў Міцкевіча і Дастаеўскага.

У цэнтры Міра ўсё пахла свежай фарбай. Як паінфармавала жыхарка гэтай мясовасці, апошнія будаўнічыя калектывы закончылі працу ў мястэчку на дзве гадзіны да пачатку святкавання. Працавалі дзень і ноч, калі з’явілася інфармацыя, што госцем у Міры будзе Аляксандр Лукашэнка. Імператар аднак не прыехаў. „Пацёмкінская вёска” — пракаментавала мясцовая настаўніца. На вуліцах агароджа аднолькавага кшталту і зялёна-жоўтага колеру, пастаўленая па загадзе адміністрацыі. Вуліца выглядала як вышываны арнамент вялікіх памераў, але падабалася насельніцтву.

Суседні Навагрудак быў адноўлены пару гадоў таму за кошт амаль мільёна долараў. Нагодай стала тады 200 гадавіна з дня нараджэння Адама Міцкевіча, якога шмат хто ў Беларусі лічыць беларускім паэтам. Сёння горад выглядае як мястэчка ў Баварыі.

Бедныя беларускія сяляне капаюць бульбу

Едучы сапраўды добрымі, але пуставатымі дарогамі Беларусі ў нядзельны дзень відаць на палях шмат людзей занятых капаннем бульбу. На загонах, побач мяшкоў, стаяць найчасцей „Мерседэсы”, „Аўдзі”, „Фольксвагены”. „Паглядзі, — сказаў іранічна калега з Гродна, — бедныя беларускія сяляне капаюць бульбу”.

Яўген Мірановіч

Новыя рэаліі беларускай адукацыі

Першы дзень верасня ўжо даўно ўвасабляе сабой не проста пачатак каляндарнай восені, але распачынанне новага навучальнага года. Ува ўсіх краінах свету дзеці і падлеткі, узяўшы падручнікі і сшыткі, асадкі і алоўкі накіроўваюцца за набыццём ведаў. Не выпадае з гэтага сусветна-адукацыйнага працэсу і Беларусь.

Новы навучальны год нясе тым, хто сядае за парты і студэнцкія лаўкі новыя веды. Але многа новага адбываецца і ў беларускай сістэме адукацыі.

З гэтай восені практычна ўсе школы распачнуць ужываць так званую „пяцідзёнку”. Гэта значыць, што на заняткі вучні сярэдніх школ будуць хадзіць толькі 5 дзён у тыдзень. Дыскусіі аб пераходзе на такую форму навучання цягнуліся ўжо даволі доўгі час. Адным з асноўных аргументаў неабходнасці новаўвядзення лічыцца надзвычайная загружанасць вучняў на працягу 6-дзённага навучальнага тыдня. І дзеля таго, каб аблегчыць дзецям працэс набыцця ведаў было вырашана аддаць 5 дзён непасрэдна пад заняткі, а шосты — суботу — пад рознастайныя пазаўрочныя мерапрыемствы кшталту спартыўных спраборніцтваў, разнастайных конкурсаў і выхаваўчых дыспутаў.

Яшчэ адной навіной стала ўвядзенне з першага верасня гэтага года ў школах Беларусі 10-бальнай ацэнкі ведаў навучэнцаў. Трэба адзначыць, што ў параўнанні з ранейшай 5-бальнай яна мае досыць многа станоўчых бакоў. Самым галоўным варта назваць больш дыферэнцыраваны падыход пры выстаўленні ацэнкі вучню за яго вусны альбо пісьмовы адказ. Сапраўды, раней ацэньваць блізкія, але ўсё ж неаднолькавыя адказы школьнікаў настаўніку прыходзілася нічым неадрознымі паміж сабой „тройкай”, „чацвёркай” ці „пяцёркай”. У выніку такой неадрознасці настаўнікі самавольна ўводзілі сваю дыферэнцыяцыю, дадаючы да вышэйзгаданых адзнак ненармаваныя „плюсы” і „мінусы”. Зараз патрэба ў такіх дадатках адпадае.

Усё вышэйпералічанае варта аднесці да станоўчых момантаў, якія адбываюцца цяпер у беларускай сістэме навучання. Але, на жаль, у новы навучальны год адукацыя Беларусі ўвайшла не без новых праблем.

Як вядома, з году ў год ідзе скарачэнне колькасці беларускага насельніцтва. Пачатае каля васьмі гадоў таму, яно ўжо дае свае незайздросныя вынікі. Перш за ўсё гэта скарачэнне колькасці вучняў, якое пацягнула за сабой скарачэнне колькасці пачатковых класаў і адпаведна настаўніцкіх пасад. Больш за ўсё ад такога веяння часу церпяць вясковыя школы, бо там скарачэнне насельніцтва, у першую чаргу дзіцячага, адбываецца ў 2-3 разы хутчэй, чым у гарадах. У выніку сёлета беларуская дзяржава пайшла на закрыццё каля сотні школ па прычыне іх так званай малакамплектнасці. Важна адзначыць, што прыгнятальная большасць сельскіх школ гэта беларускамоўныя. У выніку закрыццё іх абцяжарыла і без таго нялёгкую сітуацыю з беларускамоўным навучаннем.

Што тычыцца гарадскіх навучальных устаноў, то тут таксама не пазайздросціш працуючым у іх настаўнікам. Мала таго, што заробак апошніх даўно ўжо лічыцца адным з самых невялікіх і затрымкі з выплатай грошай ускладняюць настаўніцкае жыццё, цяпер работнікі школьнай адукацыі мусяць браць меншую колькасць гадзін выкладання свайго прадмета. Зразумела, за меншую колькасць працы і аплата меншая. Хаця людзі згодныя на змяншэнне гадзін выкладання, чым на скарачэнне пасад.

Напэўна самай прыкрай з’явай апошняга часу ў Беларусі стала змяншэнне выкладання на беларускай мове. Пачынаючы з 1995 года, калі сумнавядомым рэферэндумам у краіне ўсталявалася фармальнае двухмоўе, беларускія школы сталі знікаць. Сёння ў многіх буйных гарадах ужо няма не то што беларускамоўных школ, але і беларускамоўных класаў. У сталічным Мінску такіх школ усяго 13.

Вядома, што культура і адукаванасць чалавека вызначаюцца веданнем, перш за ўсё, роднай літаратуры і замежнай мовы. 2002 год вызначаўся ў Беларусі скасаваннем абавязковасці выпускных экзаменаў па гэтых прадметах. Няцяжка ўявіць вынікаючае з такога новаўвядзення стаўленне большай часткі вучняў да згаданых прадметаў і ведаў па іх. Больш таго, выкрэсленыя з праграмы абавязковага вывучэння творы сусветна прызнанага пісьменніка, але не згоднага з цяперашнімі беларускімі рэаліямі і таму жывучага за мяжой, Васіля Быкава.

Такім чынам, здаецца, што сістэма адукацыі на Беларусі становіцца тэхнічна і фізічна больш прыстасаванай для навучальнага працэсу. Але ці павялічваецца яе здольнасць выхоўваць грамадзяніна-патрыёта сучаснага грамадства, гэта значыць, выканаць сваю галоўную ролю — застаецца вялікім пытаннем.

Уладзімір Лапцэвіч

Маркевічам „узмацнілі” Магілёўшчыну, а Мажэйкам — Гомельшчыну

Па-за межамі Гарадзенскай вобласці будуць адбываць пакаранне журналісты забароненай гарадзенскай газеты „Пагоня”. 29 жніўня ў 18.00 у Крымінальна-выканаўчай інспекцыі Кастрычніцкага раёна Гародні ім выдадзена было прадпісанне з’явіцца на месцы адбыцця пакарання да 1 верасня: Паўлу Мажэйку — у Жлобін Гомельскай вобласці, Міколу Маркевічу — у Асіповічы Магілёўскай вобласці.

Начальнік Крымінальна-выканаўчай інспекцыі Вечаслаў Савіч выдаў журналістам па 10 000 рублёў на квіткі і папярэдзіў, што калі яны не прыбудуць на месцы пакарання да 1 верасня, то будуць арыштаваны.

Па словах Паўла Мажэйкі, падчас размовы з ім Вечаслаў Савіч паведаміў, што 99% асуджаных гарадзенцаў адбываюць пакаранне на тэрыторыі Гарадзенскай вобласці. Толькі ў выключных выпадках асуджаныя могуць быць скіраваныя па-за межы вобласці. Аднак у Камітэце выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў не ўлічылі нават тое, што Мікола Маркевіч мае 13-гадовую дачку, а гэта паводле закону дазваляла прыняць рашэнне аб адбыцці пакарання па месцы жыхарства.

— Яшчэ ў 15.00 29 жніўня спадар Савіч прапанаваў мне атрымаць прадпісанне аб накіраванні мяне ў Зэльвенскі, а Паўла — у Ашмянскі раёны Гарадзенскай вобласці, — сказаў Мікола Маркевіч. — Аднак падчас падпісання дакументаў раздаўся тэлефонны званок. Выслухаўшы таго, хто званіў, начальнік інспекцыі загадаў нам з’віцца пазней, бо ў Мінску вырашылі змяніць нам месца адбывання пакарання.

Алеся Сідлярэвіч

www.pahonia.promedia.minsk.by

XII Эканамічны форум Крыніца 2002

Аб Беларусі

Панельная дыскусія з удзелам прадстаўнікоў Эстоніі, Беларусі і Расіі прысвечана была вынікам намаганняў гэтых дзяржаў дзеля паляпшэння іх эканамічнага становішча. Паволде Паўла Данейкі з Мінскага Інстытута прыватызацыі і менеджмента, у выпадку Беларусі ўсе змены замаруджваліся пасобнымі ўрадамі, якія знаходзіліся пры ўладзе. Гаспадарчы рост 1998 г. не быў рэальным, а толькі вынікам фальшавання справаздач. А тым фактарам, які тармозіць прыток фірм на беларускі рынак, з’яўляюцца высокія кошты — у 20 разоў вышэйшыя чым у Польшчы.

http://www.interia.pl, 8.09.2002 г.

За навуку!

Прыемна было адпачываць. Лета было такое сонечнае, гарачае. Але вось пачаўся новы 200/2003 навучальны год. Пара ісці ў школу. У гэты першы дзень навукі наведалі мы Пачатковую школу ў Семяноўцы (Нараўчанская гміна).

Найперш а гадзіне 8[15] у прыхадской царкве ў Семяноўцы (яна знаходзіцца побач школы) адбылося набажэнства для школьнікаў, бацькоў і настаўнікаў. Памаліліся яны за тое, каб новы навучальны год прайшоў паспяхова. Затым у 9 гадзін 47 усіх дзетак, настаўнікі, настаяцель Семяноўскага прыхода а. Мікалай Шабелян прыйшлі ў школу. Прывітала іх цёпла, сардэчна дырэктар Ліля Тарасевіч. Асабліва перажывалі свой першы дзень у школе тыя дзеці, якія тут апынуліся ўпершыню. Гэта дзеткі з дашкольнага аддзела. Яны сядзелі як самыя найменшыя ў першым радзе і найбольш хваляваліся. Калі адважыліся расказваць пра сябе, адзін хлопчык пахваліўся, што ўмее чытаць.

Дырэктар пажадала поспехаў у новым школьным годзе вучням і настаўнікам ды настойлівасці і зразумення бацькам. Затым паінфармавала, што класнымі выхавацелямі будуць: дашкольнікаў — Ірэна Гапуновіч, другога і трэцяга класаў — Аліна Лешчук, чацвёртага — Яўгенія Сухадола, пятага — Аліна Мацкевіч ды шостага класа — Ірэна Аліхвер. Настаўніцы са сваімі вучнямі пайшлі на першую сустрэчу ў класныя залы, а мы (дырэктар школы, а. Мікалай Шабелян і я) калідорам у настаўніцкі пакой. Прыемна бачыць прыгожыя насценгазеты з фотаздымкамі з жыцця школы, дзейнасці вучнёўскага самакіравання, СКО, а таксама пра Нараўчанскую гміну ды Белавежскую пушчу. Дырэктар ахвотна расказала пра мінулагоднія поспехі вучняў, між іншым у школьных тэатральных калектывах, у галіне ашчаднасці (на кніжачках СКО вучні маюць 93 000 злотых) ды вучнёўскага самакіравання.

Летам Семяноўская школа не пуставала. Тут праводзілі свой свабодны час ды адпачывалі над возерам гарцэры з Варшавы, юныя музыкі з інструментальнага калектыва „Балалайкі" з Лодзі.

Падчас канікул памалявалі падлогі і вокны ў класах ды веснічкі ля школы. Аднавілі настаўніцкі пакой.

Варта дадаць, што ўсе былі рады сустрэчы з „Нівай". Запрасілі прыехаць і пабачыць, як моладзь будзе наводзіць парадак на беразе Семяноўскага вадасховішча (Акцыя „Прыбіранне свету адбудзецца 20-22 верасня), на Свята печанай бульбы, на Анджэйкавую забаву і г.д. Дзякуем і абяцаем наведаць.

Янка Целушэцкі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Не ўсе першакласнікі з белгімназіі вучыліся раней беларускай мове

Яшчэ без падручнікаў

[1 ☞ працяг]

У комплексе школ у час канікул адрамантавалі за свае грошы (сёлета белліцэй не атрымаў міністэрскай датацыі на рамонты) дзве залы, сталовую, частку калідораў і перакрылі дах над актавай залай. Дырэкцыя спадзяецца, што міністэрства кампенсуе частку рамонтных выдаткаў у час школьнага года. Хопіць сродкаў, каб арганізаваць у школе дыдактычны працэс, але зараз у Гайнаўцы і наваколлі пануе вялікае беспрацоўе і не ўва ўсіх бацькоў ёсць грошы на падручнікі і школьныя прылады. Могуць яны разлічваць на дапамогу гарадскога і гмінных асяродкаў сацыяльнай дапамогі.

У час мерапрыемства намеснік гайнаўскага старасты Ежы Сірак узнагародзіў дыпломамі настаўнікаў Сняжыну Пліс і Міхала Юшчука, якія нядаўна атрымалі першае настаўніцкае званне. Нядаўна дыпламаванымі настаўнікамі сталі Славамір Чыквін і Ян Карчэўскі. Пасля супольных сустрэч вучні разышліся па класах са сваімі выхавацелямі.

Аляксей Мароз

Загадкавыя рогі ў ляўкоўскай капальні

9 жніўня ў капальні пяску і гліны Прадпрыемства будаўнічай керамікі ў Старым Ляўкове (Нараўчанская гміна) Аляксандр Лаўнічук знайшоў вялікую частку рога аленя або лося, якія, як бачым, жылі тут на гэтай тэрыторыі спакон веку. Аб рэдкай знаходцы паведаміў мяне намеснік дырэктара ПБК Юрый Равінскі. Рог мае 8 см дыяметра ў тым месцы, дзе быў зрослы з чэрапам жывёлы.

Не першая гэта знаходка ў ваколіцы сяла Старое Ляўкова. 20 гадоў таму ў капальні пяску Сяргей Бандарук знайшоў ікол дагістарычнага слана 10 000-гадовай даўнасці. Іншай цікавай знаходкай былі — як акрэслілі археолагі — косці лася 100 000-гадавой даўнасці.

Варта дадаць, што капальні (пяску асобна і гліны асобна) у старым Лукове знаходзяцца на месцы тарфянікаў у старым рэчышчы Нараўкі. Пясок здабываюць з-пад паверхні вады. Даўным-даўно ў гэтым месцы — як гавораць тутэйшыя старажылы — былі вялікія балоты, дрыгва-твань. Бывала, тапіліся валы і вазы з сенам, калі ў сухое лета або зімою сюдою перапраўляліся на суш.

Янка Целушэцкі

Роўны старт

У Падляшскім ваяводстве 4 293 вучні з убогіх сем'яў могуць атрымаць дапамогу ў відзе ранца, спартыўнага строю, падручнікаў і школьных прылад. Гэта гарантуе ўрадавая праграма выраўнавання варункаў школьнага старту (г.зв. школьнае прыданае). Спіскі такіх вучняў састаўлялі школы або гмінныя асяродкі грамадскай дапамогі і перадавалі іх у гмінныя ўправы. 6 жніўня гміны атрымалі дапамогу з кураторыі.

У Арлянскай гміне гэтай дапамогай пакарысталася надзвычай многа дзяцей, што сведчыць пра незаможнасць грамадства. Як паінфармавала Валянціна Казак з Гміннага асяродка грамадскай дапамогі ў Орлі, прыданае ў першы клас атрымала 12 дзяцей. У прыданае, вартасцю ў 90 зл., увайшлі ранец, гімнастычны строй і школьныя прылады. Апрача гэтага кожнае назначанае дзіця атрымала школьныя падручнікі вартасцю ў 75 зл.

На агульную колькасць 21 другакласнік, для дапамогі закваліфікавана 12 дзяцей; на падручнікі прыдзелена ім па 130 зл.

З 25 трэцякласнікаў для дапамогі кваліфікавана чацвёра дзяцей, якім будзе прыдзелена па 140 зл. на падручнікі.

Міхал Мінцэвіч

У Гарадоцкай гміне

Гарадоцкая гміна ў супрацоўніцтве з Навучальным цэнтрам Фонду развіцця вёскі прыступіла яшчэ летась да апрацоўкі „Стратэгіі грамадска-гаспадарчага развіцця на 2001-2015 гады".

Працы над тым дакументам рушыліся наперад. Састаўлены ўжо рапарт аб становішчы гміны, які ахоплівае дыягназ і актуальную грамадска-эканамічную сітуацыю гміны. Праведзена было апытанне жыхароў, з якога атрыманы былі інфармацыі пра ўмовы жыцця і планах на будучыню. Наступным этапам рэалізацыі стратэгіі быў аналіз найбольш істотных праблем, выступаючых у гміне, выбар мэтаў і стратэгічных задач і стварэнне візіі гміны на 15 гадоў. З гэтай мэтай арганізаваліся г.зв. „варштаты", у якіх прымалі ўдзел жыхары, радныя, святары, дырэктары школ, бізнесмены і працаўнікі гміннай установы. Заняткі вялі супрацоўнікі Навучальнага цэнтра ФРВ у Беластоку.

Кожны ўдзельнік мусіў прыгадаць па тры найважнейшыя праблемы гміны, якія кранулі б справы грамадскія, гаспадарчыя, аховы асяроддзя. Вылучаны былі 9 праблем. Пасля акрэслення ўдзельнікамі, колькі, на іх думку, пунктаў важнасці прызначыць кожнай з праблем, сцвердзілі яны, што найбольш балючай справай ёсць беспрацоўе, якое вынікае з абмежаванага рынку працы (былі зачынены найбольшыя прадпрыемствы, напр. КАРО, а мала месцаў створана, брак рынку збыту на сельскагаспадарчыя вырабы). На другім месцы апынулася не найлепшая тэхнічная структура і недастатковая грамадская. Тут пералічваецца брак спецыялістычнага абсталявання і машын, уцёкі моладзі ў гарады ў пошуках працы, састарэнне вёскі і г.п. Іншая справа — паніжэнне даходаў — адносна з кожным годам грамадства менш заможнае. Наступная заўвага — нізкі ўзровень актыўнасці жыхароў, нявыкарыстанне рэсурсаў (напрыклад, турыстычных) асяроддзя, узрост некаторых грамадскіх паталогій, нізкая экалагічная свядомасць жыхароў, малы адсотак людзей з акадэмічнай адукацыяй, пагроза для асяроддзя ў сувязі з машынным рухам звязаным з пагранпераходам у Баброўніках.

На чарговых сустрэчах праводзіліся заняткі па апрацоўцы стратэгіі Гарадоцкай гміны з ухілам пошукаў козыраў і слабасцей, шанцаў і пагроз важных для эканамічнага развіцця гміны да 2005 года. Сярод козыраў удзельнікі варштатаў з адной групы падалі: натуральнае багацце лясоў, вялікае прапанаванне рабочай сілы, гасцінасць людзей, свабодныя аб'екты для загаспадарання, добрую інфраструктуру (водаправоды, каналізацыя, тэлефоны), багатую культурную і гістарычную спадчыну), шмат зялёнай тэрыторыі для развіцця гадоўлі, „акно на свет" — пагранпераход у Баброўніках, чыстыя воды, фестываль „Басовішча", прадукцыю здаровых харчоў і малака, звальненне ад падаткаў для пачынаючых гаспадарчую дзейнасць. Другая група ў той самы чыс падбірала ўнутраныя слабасці развіцця гміны. Да кожнага з пунктаў аднёсся войт Яўген Семянюк. Важнейшыя са слабасцей гэта: дэмаграфічныя праблемы (састарэнне грамадства), нізкія кваліфікацыі рабочай сілы, нізкая грамадская актыўнасць жыхароў, узрастаючае беспрацоўе, недахоп уласнага капіталу і збядненне жыхароў, нізкі ўзровень тэхнічнай і грамадскай інфраструктуры, праблемы з адукацыяй на сярэднім і вышэйшым узроўні, доступам да спецыялістычнага лячэння, малая прамоцыя гміны, заніканне культурных традыцый, ахова асяроддзя (адборка смецця, аўтафуры), недахоп турыстычнай базы на еўрапейскім узроўні. Сярод шанцаў — прыгранічнае супрацоўніцтва, усходняя мяжа Еўрасаюза, электрыфікацыя чыгункі Беласток — Зубкі — Мінск і вяртанне пасажырскага руху, зацікаўленне інвестараў прыгранічнымі тэрыторыямі, дапамога для эканамічна занядбанай тэрыторыі, праграма дапамогі сялянам пры аблясенні найслабейшых зямель, развіццё інфраструктуры пры шляху Е-65, а таксама магчымасць заснавання агульнаадукацыйнага ліцэя ў Гарадку.

З унутраных слабасцей гміны — палажэнне гміны (усюды далёка), эканамічная палітыка, якая не спрыяе развіццю малых цэнтраў, брак прасямейнай палітыкі, нестабільная падаткавая сістэма, заняпад у гандлі з Усходам, брак адпавеных датацый для сельскай гаспадаркі — недахоп рынкаў збыту, сацыяльная палітыка дзяржавы і яе палітыка супрацьдзеяння беспрацоўю.

Як бачыла б гарадоцкае грамадства сваю гміну? Багатую, з добра разбудаванымі транспартам, турызмам і гандлем. Такую, у якой хацелася б жыць. Незалежна ад таго, хто будзе мець у ёй уладу пасля выбараў.

Міра Лукша

Ідзем самастойна

Фота Міры Лукшы

Размова з сакратаром Беларуска-народнага выбарчага камітэта выбаршчыкаў з Гайнаўкі Міхасём АНДРАСЮКОМ, адказным за кантакты з сродкамі масавай інфармацыі.

— Некалькі месяцаў таму быў створаны Беларускі выбарчы камітэт. Як ідзе падрыхтоўка да самаўрадавых выбараў?

— Яшчэ ў ліпені вырашылі мы, што на спісках БВК будуць балатавацца беларусы, якія з'яўляюцца сябрамі сялянскай партыі ПСЛ і памянялі назву камітэта на Беларуска-народны выбарчы камітэт выбаршчыкаў. З такім самым названнем выбарчага камітэта ішлі мы на выбары чатыры гады таму. Калі паляк схоча кандыдаваць з нашага спіска, можа таксама гэта зрабіць.

— Ці плануеце ствараць большую каліцыю?

— Ідзем на выбары самастойна, але не выключаем, што будзем шукаць каліцыянтаў пасля выбараў.

— Хто можа стаць вашым каліцыянтам?

— Не выключаем ніякай групоўкі.

— Ці падрыхтаваны ўжо спіскі кандыдатаў?

— Так, але яшчэ яны не закрытыя. Плануем выставіць максімальную колькасць кандыдатаў на радных Гайнаўскага павета, 16 кандыдатаў з горада Гайнаўкі і 18 кандыдатаў з трох вясковых округ. Намерваемся паставіць максімальную колькасць кандыдатаў у выбарах у Раду горада Гайнаўкі — у 3 округах па 14 асоб. У некаторых вясковых гмінах, між іншым, Гайнаўскай, Нарваўскай і Кляшчэлеўскай хочам паставіць сваіх кандыдатаў ува ўсіх округах. У іншых гмінах нашы кандыдаты будуць балатавацца ў паасобных округах.

— Ці плануеце ставіць сваіх кандыдатаў у выбарах на бурмістра Гайнаўкі і войтаў вясковых гмін Гайнаўшчыны?

— Праўдападобна выставім кандыдата на бурмістра Гайнаўкі, а ў некаторых вясковых гмінах нашы кандыдаты будуць прымаць удзел у змаганні за пасады войтаў.

— Якіх кандыдатаў будзе падтрымліваць БНВК у выбарах у Ваяводскі соймік?

— Будзем падтрымліваць усіх беларускіх кандыдатаў, якія будуць выступаць на спісках розных груповак.

— У якіх округах разлічваеце на самую вялікую перамогу?

— Лічым на перамогу ва ўсіх округах, дзе будуць балатавацца нашы кандыдаты. Наш выбарчы камітэт з'яўляецца адным з самых вялікіх камітэтаў, якія рыхтуюцца да выбараў на Гайнаўшчыне. Па велічыні можна параўнаць нас да камітэтаў СЛД ці АВС.

— Ці падрыхтаваная ўжо выбарчая праграма?

— Стварылі мы групу спецыялістаў, якая распрацоўвае праграму. Радны ад БНВК павінен займацца, як і іншыя радныя, водаправодамі, каналізацыяй, дарогамі, павінен намагацца аблягчаць жыццё жыхарам. Апрача гэтага павінен вырашаць пытанні асветы і культуры беларускай меншасці. Самым вялікім поспехам БНВК за апошнія чатыры гады ў галіне беларускіх спраў было стварэнне Беларускай гімназіі ў Гайнаўцы. Наш выбарчы камітэт выступаў за стварэнне ў горадзе аддзялення вышэйшай навучальнай установы, што і здзейснілася. Важнай справай будзе наладжванне кантактаў з Беларуссю. Уся Польшча ідзе на захад, але трэба ўзмацняць кантакты з усходам. Неабходна, каб жыхары Гайнаўкі ведалі крыху пра Беларусь і каб не паўтарыўся выпадак, што на афіцыйным мерапрыемстве наадварот павесяць дзяржаўны лукашэнскаўскі сцяг. Больш практычным быў бы гістарычны, бел-чырвона-белы, бо тады як не павесіш, будзе добра.

— Дзякую за размову

Гутарыў Аляксей Мароз

PS. У пачатку верасня на Гайнаўшчыне арганізавалася 5 вялікіх выбарчых камітэтаў. Апрача БНВК дзейнічаюць выбарчыя камітэты СЛД, Гайнаўскай зямлі і два правых груповак. А. М.

Вялікая палітыка і тэрарысты

З нагоды гадавіны атаку арабскіх тэрарыстаў на амерыканскія вайсковыя, адміністрацыйныя і фінансавыя цэнтры сродкі масавай інфармацыі сотні раз пакажуць упадак найвышэйшых будынкаў свету, плач і роспач сем'яў ахвяр загінуўшых у руінах. Мала хто з журналістаў і палітыкаў ужо памятае, што год раней на сербскія гарады некалькі месяцаў падалі бомбы, а людзі, якія пасылалі самалёты са знішчальнай зброяй, выступалі публічна як абаронцы свабоды, правоў чалавека і ніхто ды ніколі не прабаваў нават ацаніць таго міжнароднага тэрарызму, з якім сустрэліся сербы вясной 2000 года.

Усё пачалося з таго, што албанская мафія ў 1996 г. у сербскай правінцыі Косава стварыла „нацыянал-вызваленчую армію" — УЧК і пачала атакаваць сербаў і цэнтры дзяржаўнай улады. Спробы вярнуць парадак пры дапамозе паліцыі і арміі выклікалі вайну пакта НАТА супраць Сербіі пад лозунгам абароны правоў чалавека. Пры дапамозе авіяцыі амерыканцы і іх еўрапейскія хаўрыснікі знішчылі сербскую прамысловасць, масты, дарогі, забілі пару дзесяткаў мірных людзей. Сербія, якую здрадзіла нават Расія, вымушана была капітуляваць і вывесці свае войскі з уласнай правінцыі Косава. Тады пачалася трагедыя тамашняга сербскага і ромскага насельніцтва. Мафійныя банды УЧК, якіх натаўская прапаганда аб'явіла вызвольным рухам, пачалі знішчэнне ўсіх неалбанцаў, што выклікала масавае бежанства. З Косава ўцякло каля 400 тысяч сербаў. У пару мястэчках асталося некалькі тысяч людзей гэтай нацыянальнасці, якіх затрымалі натаўскія салдаты, але хіба толькі таму, каб даказаць сэнс свае місіі. Цяпер ахоўваюць кварталы, у якіх пражываюць сербы. Гэта энклавы, жыхары якіх не выходзяць за межы вызначанай зоны без вайсковывай аховы.

„У Косаве няма сербаў, — гаворыць у інтэрв'ю для часопіса „Polityka" (н-р 34) прадстаўнік Польшчы па справах правоў чалавека у Косаве Марэк Антоні Навіцкі. — Ёсць мафія, кантрабанда і карупцыя". Косава пад натаўскім пратэктаратам стала еўрапейскім цэнтрам гандлю наркотыкамі, зброяй, жывым таварам. Гарады пераўтварыліся ў лагеры, якімі кіруюць жорсткія баевікі УЧК. Навіцкі адкрыта гаворыць: „Трэба будзе пераацаніць некаторыя меркаванні адносна ходу здарэнняў у Косаве пачынаючы з 1996 г., калі ўзнікла УЧК. Гэта далікатная справа. У даны момант перад Гаагскі трубунал прыцягнуты толькі адзін бок — сербскі. Калі прыцягнуць другі бок — албанскі, не вельмі гэта будзе ўпісвацца ў афіцыйную версію таго, што здарылася ў Косаве".

Чытаючы выказванне прадстаўніка Польшчы ў Косаве, прыпамінаецца вясна 2000 г. і ваенная антысербская прапаганда ў дзяржаўным радыё і тэлебачанні, газетах, а асабліва ў штодзённы „Gazeta Wyborcza". Ад імя прэзідэнта Рэчы Паспалітай Аляксандра Кваснеўскага першага дня вайны выказваўся яго міністр па справах бяспекі Марэк Сівец. Гаварыў ён: „Бомбы, якія падаюць на Бялград, нясуць мір". А на першай старонцы „Gazety Wyborczej" яе галоўны рэдактар Адам Міхнік пісаў „Агрэсар будзе пакараны". Гэтым агрэсарам мелі быць сербы і па словах Міхніка выглядала, быццам яны напалі на Амерыку, Вялікабрытанію, Нямеччыну ці Польшчу. Крывадушнасць выступіла з берагоў. „Gazeta Wyborcza" адкрыта стала вайсковым бюлетэнем НАТА, а ў тэлебачанні прапагандыст і маніпулятар Вальдэмар Мілевіч кожнага дня паказваў рэпартажы пра выгнаных са сваіх вёсак албанцаў. Не ўспамінаў толькі ніводным словам, што большасць з іх уцякала ад натаўскіх бомб. Пару тыдняў пазней, калі албанцы забівалі сербаў і калі гэтыя апошнія пачалі масава ўцякаць, вядомыя з тэлебачання абаронцы правоў чалавека і гуманісты, як Вальдэмар Мілевіч, Іаланта Пянькоўская, Адам Міхнік, Браніслаў Герэмэк, Аляксандр Кваснеўскі, Марэк Сівец, Мар'ян Кшаклеўскі, Ежы Бузэк, Чэслаў Бялецкі і дзесяткі іншых, якія раней стваралі антысербскі ваенны псіхоз, займаліся ўжо зусім іншымі праблемамі.

Тая вайна паказала адназначна, што можна ў сучасным свеце зусім бяскарна напасці на любую краіну, зраўняць з зямлёй яе гарады, забіваць жыхароў, а прапаганда і вялікія аўтарытэты пераканаюць сусветнае грамадства, што нават забітыя дзеці былі пагрозай для міру і дэмакратыі. Арабскія тэрарысты гэта фанатыкі, якія злачынства ў Амерыцы ўчынілі ад імя псіхапата. Тэрор супраць сербаў быў вынікам рашэння праўлення дэмакратычных краін ад імя сваіх народаў. Працягваўся ён тыднямі, а інтэлектуальныя эліты, за невялікімі выключэннямі, апраўдалі злачынства. Пакуль што ніхто не пакаяўся за пакуты соцень тысяч зусім невінаватых людзей.

Яўген Міранові ч

Вачыма паляка

Бацылы слабасці

Слабасць, так сказаць, справа людская. Здаецца, вядома. Ды хто з нас мае адвагу да яе прызнацца. Не кажу тут пра эксгібіцыянізм, значыць, пра такое стаўленне, калі чалавек абносіцца са сваімі заганамі, спрабуе з іх ствараць каштоўнасць, прынцыпова разлічваючы на спачуванне іншых або на іншыя рэакцыі, якія дазволяць яму самому заглушыць недахопы.

Ці хочам таго, ці не, ёсць у нас слабасці: у адных — цела, у іншых — душы (характару, сілы волі і г.п.), а ў іншых і тыя, і другія. Хай хтосьці кіне каменем, у каго іх няма — хацелася б сказаць.

Так сабе пачаў я думаць аб тых справах, калі Інстытут нацыянальнай памяці, а за ім медыя, пачалі ў апошні час рассакрэчваць справы, якія кранаюць супрацоўніцтва каталіцкіх ксяндзоў са службамі бяспекі Польскай Народнай Рэспублікі. Адзін мой знаёмы, які дэкларуецца як артадаксальны правіцавец (чытай: быццам бы нацыянальны католік), усчаў у размове са мною лямант:

— Што гэта за нападкі? Узяліся б за папоў! — грымеў, абураны. — Там дык было ўбекаў!

Няма ў мяне дастатковых гістарычных ведаў, г.зн. доступу да архіўнай дакументацыі, дарэчы, падобна, як і ў майго быццам бы правага знаёмага. Цяжка было мне аўтарытэтна весці з ім дыскусію на гэту тэму. Здзіўляла, аднак, ягоная прынцыповасць і ўпэўненасць у адносінах да клерыкальнага праваслаўнага асяроддзя. Мае і, я ў гэтым упэўнены, ягоныя веды абмяжоўваюцца выключна да жыццёвага вопыту і вуснага пераказу сям'і і знаёмых ды рознай масці публікацый, малатыражных, якія апіраюць свае ацэнкі на загадкавых крыніцах, трактаваных гісторыкамі як малаверагодныя па прычыне г.зв. даследчыцкага варштату.

Я не ўмею адназначна, як мой знаёмы, сцвердзіць, што такія і такія асяроддзі супрацоўнічалі са службамі бяспекі. Пэўна, у кожным асяроддзі: і касцельным, і свецкім бывалі (і надалей ёсць?) г.зв. даносчыкі, супрацоўнікі службаў. Як можна меркаваць, часта яны не кіраваліся ахвотай шкодзіць свайму асяроддзю, сябрам ці краіне (змоўчым тут пра звычайных свіней). Іх проста шантажыравалі. Выкарыстоўваючы, вось, іх слабасці. У „Кур'еры паранным" доктар Кшыштаф Сыховіч з беластоцкага ІНП казаў: „УБ дашукоўваўся такіх слабасцей, як злоўжыванне алкаголем, схільнасць да азарту, выцягваў нейкія фінансавыя, сексуальныя справы, сачыў за сем'ямі. Пасля ставіў інфарматара перад выбарам, які, папраўдзе, быў шантажам: альбо пра гэта распавядзем, альбо будзеш з намі супрацоўнічаць".

Доктар Сыховіч гаварыў пра ксяндзоў, але, думаю, ягонымі назіраннямі (навуковагістарычнымі!) можна ахапіць таксама большасць свецкіх, якіх запуталі ў камуністычную сістэму сочкі (інвігіляцыі), распрацоўвання дэструктыўных сіл.

Аднак, у выпадку духоўных, справа больш далікатная. Святары, незалежна ад царквы, якую прадстаўляюць, не павінны былі паддавацца вярбоўцы, шантажу, дазваляць выкрываць свае слабасці. Хто ж больш, як не духоўныя, можа даць прыклад у змаганні са слабасцямі. І нясмачнай крывадушнасцю было адсоўванне набок такіх ксяндзоў іхнімі кіраўнікамі, напрыклад, іх ссылка ў вясковыя парафіі. Так было ў час усямоцных УБ і СБ. „Звычайна, калі былі западозранні, што якісь з духоўнікаў — супрацоўнік СБ, перасялялі яго на менш відныя правінцыйныя парафіі, дзе не мог ні ўдзельнічаць у жыцці асяроддзя, ні кантактавацца са значнымі асобамі", — тлумачыць К. Сыховіч. Так са „слабымі" кіраўнікі цэркваў абыходзяцца і сёння. Што канчаецца, бывае, трагедыяй і саміх святароў ды пакідае вернікаў у смутку і сумненні.

Вернемся да тэзіса майго знаёмага пра асаблівую ролю, якую адыгралі ў сістэме сочкі ПНР праваслаўныя духоўныя. Як сцвярджае на падставе сваіх даследаў доктар Сыховіч, у 1949 г. было пяцёх інфарматараў сярод каталіцкіх ксяндзоў і двух праваслаўных. „Гэтае асяродзе, разглядаючы даступныя матэрыялы, здаецца мне больш прыхільным народнай уладзе, але было таксама інвігіляванае, як каталіцкія асяроддзі, гэта значыць, была праводжана сочка за святарамі, вылоўліваліся іхныя сарамлівыя схільнасці".

Кожны з нас мусіць сам змагацца са сваімі слабасцямі, навучыцца з імі весці барацьбу альбо пагаджацца з імі, калі не маюць яны згубнага ўплыву на іншых і на нас саміх. Добра было б, каб менш слабыя ўмелі, хацелі і маглі дапамагаць. На жаль, ёсць так, што найчасцей „мацнейшыя" не ўмеюць альбо не хочуць; баяцца, што аслабнуць. Быццам слабасць была заразнай. А сам іх страх — таксама ж слабасць. Як страх перад слабасцю слабых, які не раз папіхае да розных заганных учынкаў. Той мой правы знаёмы, проста, баіцца інфекцыі.

Мацей Халадоўскі

Ля калыскі Якуба Коласа

Фота ВЕЧАСЛАВА ХАРУЖАГА

Скажу праўду — інфармацыя, што будзем падарожнічаць па Коласавых і Купалавых месцах, прыгнятала. Ранейшыя візіты ў музеях гэтых класікаў хутчэй адбіралі ў мяне цікавасць да ўсяго на свеце. Не люблю, як побач літаратурнай спадчыны вісяць драўляныя бароны і андаракі.

З другога боку — люблю бываць у месцах паэтаў. Адчуць дух месца, краявід, глянуць як бачыцца свет з акна літаратара. І яшчэ адна нагода — хацелася зірнуць, як святкуецца 120 гадавіна з дня нараджэння класікаў.

* * *

І вось, раніцай, на Спаса, мы завіталі ў Акінчыцы. Мы — адборная кампанія беларусафілаў: доктар і даследчык гісторыі Лена Глагоўская, радыёжурналістка і перакладчыца беларускай літаратуры Анна Сабэцкая, настаўнік і журналіст Вячаслаў Харужы, студэнтка сацыялогіі і беларусістыкі Іаанна Тамчук, гродзеньскі паэт Юры Гумянюк, Сцяпан Свярубскі і ніжэйпадпісаная ветэранка падарожжаў па Беларусі.

На месцы даведаліся мы, што ў панядзелкі — выхадны дзень і музей не працуе. Наш шафёр Саша, які не раз прывозіў сюды турыстаў, адразу і спыніўся каля хаты загадчыцы. Счакаўшы хвілін дваццаць, разам з Зофіяй Пятроўнай Міцкевіч, паехалі мы ў хату-музей. Сапраўдная хата, дзе нарадзіўся аўтар „Новай зямлі", не захавалася. Сучасны домік, разам з адрынай, пограбам і калодзежам з жураўлём складаюць мініяцюрны комплекс. Скансэн пабудавалі дваццаць гадоў таму, у сотую гадавіну з дня нараджэння класіка.

Уваходзім у хатку. На покуце ікона Маткі Боскай Чанстахоўскай, аздоблена ручніком.

— Ёсць падставы меркаваць, што Колас быў католікам, — кажа Зофія Міцкевіч, у прыватнасці, жонка ўнука брата Якуба Коласа. — Прадзед Коласа, Казімір, быў уніятам. Паводле сямейнай легенды, казакі сілком навярнулі яго ў праваслаўе. Пасля Казіміраў сын Міхал ахрысціў будучага пісьменніка ў Новым Свержані. Невядома толькі, дзе хрысцілі — у царкве, касцёле ці кальвінскім зборы? І, як на злосць, прапалі дакументы.

— Перакананне, што ён „рускай веры", выйшла ад прарасійскіх савецкіх даследчыкаў, — кажа Зофія Пятроўна.

* * *

Будучы класік, Кастусь нарадзіўся як трэцяе дзіця, пасля яго ў сямі з'явілася яшчэ дзесяцёра. У Акінчыцах жыў толькі чатыры з паловай месяца. У музеі арыгінальная калыска класіка. Амаль палову займае гліняная печ. Чужаземцы глядзяць на яе і захапляюцца:

— Што гэта за камп'ютэр? — спытала раз амбасадар Японіі.

Хаця хата з адной ізбы, адчуваецца ў ёй многа прасторы. Уражвае сваёй функцыянальнасцю. Няма тут непатрэбшчыны, лішняй мэблі, прыладаў. Пануюць натуральныя, сцішаныя колеры дрэва.

Дом стаіць у сімвалічным месцы. Ля старажытнага гасцінца „Кацярынка". Дарога, названая ў гонар рускай імператрыцы, спалучала Пецярбург, Варшаву, Берлін, Парыж і Ватыкан. Бацька Коласа, пакуль стаў лесніком, пільнаваў гэту дарогу, браў мыта за карыстанне шляхам.

Недалёка ад дому плыве Нёман.

* * *

Сядзім за сталом у родным доме Якуба Коласа і мяркуем — наколькі музей ёсць месцам жывой інспірацыі? Ці не з'яўляецца ён яшчэ адным постсавецкім месцам для разнавідных дэлегацый? У памятнай кніжцы подпісы на шмат якіх мовах свету.

— Найбольшую колькасць наведвальнікаў складаюць школьнікі, — тлумачыць Зофія Міцкевіч. Турыстычны сезон ажыўляецца тут пры канцы і пачатку школьнага года.

— Зараз у нас адчуваецца пэўны крызіс, — адзначае загадчыца, — многім вучням не пад сілу прыехаць у музей на ўласны кошт.

Цікавасць да беларускай літаратуры хіліцца ў бок заняпаду. Гэта эфект паўсюднай асіміляцыі ў школах. У Стоўбцах (зараз Акінчыцы — частка Стоўбцаў) няма ні адной беларускай школы. У Мікалаеўшчыне, дзе імем класіка названа пачатковая школа, працуюць яшчэ беларускія класы. Сам Колас, будучы ўжо жывой легендай, часта прыязджаў на бацькаўшчыну. Дарэчы, на свой кошт прапанаваў пабудаваць школу ў Мікалаеўшчыне.

* * *

У адрыне — этнаграфічная экспазіцыя, пра якую распавядае нам Юры Міцкевіч, унук Язэпа Міцкевіча, Коласавага брата. Кросны, прылады для апрацоўкі льну, бароны.

Найцікавейшая, аднак, жывая сустрэча з прадаўжальнікамі роду пісьменніка. Спадар Юры — таленавіты расказчык і індывідуальнасць. Інфармацыі насычвае гумарам, прыводзіць цытаты з „Новай зямлі".

Пра святкаванне 120 гадавіны даведаемся пазней. Нашу ўвагу прыцягнула поўная адсутнасць турыстычнай інфраструктуры. На месцы нараджэння аднаго з найбольш вядомых літаратараў немагчыма купіць паштоўку, кніжку ці іншы сувенір. У рукі трапляе даведнік, надрукаваны ў Маскве ў 1988 годзе на рускай мове. Колас выступае тут як слуга працоўнага народу, пясняр светлага заўтра.

Дарэмна ў музейным комплексе шукаць кавярню ці туалет.

Недахопы, у пэўным сэнсе, ратуюць родныя Коласа. Яны пакідаюць добрае ўражанне ў госця. Адчуваецца тут свойскасць, вясковую хлебасольнасць і цікаўнасць да наведвальніка. Мы як замежная „дэлегацыя" атрымалі гурбу спасаўскіх яблык.

— А ў нас таксама сям'я ў Польшчы, — адзначае пані Зофія. Нашчадакі і сваякі гэтых Міцкевічаў пражываюць у Кашаліне, Влацлаўку, Познані, Цехацінку і Чорнай-Беластоцкай. Сімпатыя да палякаў ёсць паўсюднай з'явай у беларускай правінцыі. Дарэчы, хаця мы не карысталіся перакладчыкам, усё роўна празвалі нас „замежнай дэлегацыяй"! Як прыстоіць сапраўднай дэлегацыі, пакінулі мы след у памятнай кніжцы. Тэкст прыдумаў наш паэт. „Як цудоўна ля калыскі Якуба Коласа!" — расчуліўся Юрась.

Паводле Зофіі Міцкевіч — калыска сапраўдная. Мы ацанілі гэту дэталь. А амаль ува ўсіх музеях Беларусі выстаўляюць выпадковую этнаграфію і муляж.

Ганна Кандрацюк

Фота ВЕЧАСЛАВА ХАРУЖАГА

У бельскай бальніцы

Медыцынская служба і праблемы з ёю звязаныя нечужыя нам усім. Кожны з нас наракае на чэргі да спецыялістаў, неадпаведныя гадзіны прыёму і несімпатычны персанал дзяржаўных шпіталяў. Праўду гаворачы, мала хто з нас ведае сапраўдную сітуацыю і праблемы шпітальных калектываў.

Пераносім гэтыя непрыемнасці, бо бракуе нам грошай на візіты ў прыватных клініках, і абвінавачваем рэформу, якая не прынесла нічога добрага. Раней так ніколі не было! — гавораць расчараванныя.

На нашых вачах абанкучваюцца і закрываюцца новыя бальніцы, але будуюцца „палацы"для Кас хворых. „І гэта ўсё за нашы грошы!" — наракаюць пацыенты. Падобныя словы можна цяпер пачуць ад працаўнікоў шпіталя ў Бельску-Падляшскім.

Сітуацыя шпіталя ўскладнілася, калі дырэктарам стаў Анджэй Грынявіцкі. Выбар яго на гэту пасаду нават і цяпер выклікае эмоцыі. Каб заняць пасаду дырэктара, трэба мець шесць гадоў стажу, а ён меў толькі чатыры гады і шэсць месяцаў працоўнага стажу.

Вялікі, 4-мільённы доўг шпіталя і абвінавачванне дырэктара ў негаспадарнасці — гэта наступныя прычыны непрыемнай сітуацыі. Дырэктар адрамантаваў толькі гінекалагічнае аддзяленне, а на інтэрністычным — тынк адпадае ад сценаў, што выклікае незадаволенасць супрацоўнікаў. Грошы на рамонт шпіталь атрымаў ад Міністэрства аховы здароўя і падляшскага ваяводы. Трэба аднак адзначыць, што цяпер гінекалагічнае аддзяленне ў бельскім шпіталі самае лепшае ў ваяводстве.

Наступны папрок датычыць нязгоднага з законам прызначэння ардынатараў — без конкурсаў на гэтыя пасады. Такім чынам памяняліся кіраўнікі артапедыі, хірургіі, педыятрыі і ратунковага аддзялення. Прычым дырэктар зрабіў каштоўную памылку, за якую заплаціла і так пустая шпітальная каса. Нягледзячы на водпуск, вызваліў ён з пасады ардынатара хірургічнага аддзялення. Той накіраваў справу ў суд і атрымаў кампенсацыю (каля 5 000 зл.). Працаўнікоў узбударажыў таксама факт прызнання дырэктару, ухвалай Праўлення павета, узнагароды „за працу" — 3 000 зл. — без дабра прышпітальнай грамадскай рады — (дакладна не было пададзена за што прызначаюць яму ўзнагароду).

Здіўленне і непрыхільнасць супрацоўнікаў выклікалі частыя камандзіроўкі дырэктара. На працягу першых адзінаццаці месяцаў працы знаходзіўся ён у камандзіроўках (часта выязджаў нават два разы ў дзень) 130 дзён, значыць чатыры месяцы. Прабываў ён таксама і на платным, месячным водпуску для падрыхтоўкі да экзамену на юрысконсульта.

Праблемы ў бельскім шпіталі выклікалі кантроль Вышэйшай кантрольнай палаты, потым пайшлі кантролі ваяводы, павятовых радных, аднак ніякіх закідаў дырэктару не прад'яўлена.

Цяпер справай бельскага шпіталя заюмаюцца кантралёры з Падляшскай ваяводскай управы і Акруговай інспекцыі працы. Нават пракуратуру сталі цікавіць праблемы бальніцы, аднак гэта ні ў чым не палепшыла сітуацыі працаўнікоў шпіталя. Медсёстры далей чакаюць прызнаных міністэрствам і судом грошай, а атмасфера далей згушчаецца і не спрыяе рабоце.

Як закончыцца справа шпіталя ў Бельску-Падляшскім адказаць цяжка. Дырэктар сцвярджае, што дзякуючы яму бальніца выходзіць з даўгоў, папраўляецца сітуацыя з медыкаментамі, абсталяваннем, а папрокі супрацоўнікаў называе палітычнай гульнёй. Супрацоўнікі і гарадскія радныя пярэчаць гэтаму і сцвярджаюць зусім іншыя факты. А хто на гэтым страціць найбольш? Напэўна мы — пацыенты, але і працаўнікі бальніцы, якія хочуць толькі атрымаць зарплату за сваю цяжкую працу.

Паўліна Шафран

Зорка

старонка для дзяцей

Вершы Віктара Шведа

Нашы пажаданні

Час маланкава ўцякае,
Хутка дзеці вырастаюць.
Споўнілася нашай Наце
Сёння ўжо гадоў дванаццаць.

Не дзіця яна ўжо — моладзь,
Кончыць прадставовы школы,
І другі ўжо этап блізка —
Ната будзе гімназісткай.

Года школьнага пачатак,
Працы многа мае Ната,
Каб закончыць паспяхова
Свае школы ў годзе новым.

Таму пажадаем сёння
Добрага здароўя Доні,
А таксама шчасця многа
І ў навуцы перамогі.

Беласток, 15.09.2002 г.

Натальцы 12 гадоў

15 верасня — дзень нараджэння Наталькі Швед. Ёй споўніцца 12 гадоў. Дзяўчына — вучаніца трох шостых класаў. Як гэта магчыма? — падумаеце. Проста, Наталля ходзіць адначасна ў тры школы: пачатковую, музычную і балетную.

З першага класа наша сяброўка вывучае беларускую мову. Удзельнічае ў дэкламатарскіх і тэатральных конкурсах і заваёўвае там прэстыжныя месцы.

Нашы чытачы добра ведаюць Наталлю. Гэта ёй прысвяціў Віктар Швед паэтычны цыкл „Вершы Натальцы". Яна гераіня і натхняльніца многіх вершаў, якія друкаваліся ў „Зорцы".

Натальцы ў дзень нараджэння жадаем:

— каб любілі яе класныя сябры і каб вучоба прыносіла радасць,

— каб натхняла свайго бацьку да творчай працы,

— каб расла ўсім нам на славу!

Гэта пажаданні ад Зоркі і... думаю, многіх нашых чытачоў.

ЗОРКА

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Наталька Швед — V кл. ПШ н-р 4 у Беластоку, лаўрэатка І месца конкурсу „Роднае слова"

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ

Заяц варыць піва

Туман плыве з пізіны сівы
Над нівай голай і пустой.
„Глядзіце, заяц варыць піва", —
Жартуюць людзі між сабой.
А я відушчым бачу зрокам,
Як ён прысеў каля агню,
Трыгубы, шэры, касавокі,
І піва варыць з ячмяню.
Яліна іскрамі страляе,
А ён прыладзіў кацялок
І трэскай варыва мяшае,
Каштуе, сплёўвае пабок.
І піва заяц зварыць густа,
А на закуску — бурачок,
Трава, заечая капуста,
Галін асінавых пучок.
З зайчыхай вып'юць па маленькай
І дзеткам трошкі паднясуць,
Пужлівым галаском таненькім
„Цвіцела морква" завядуць.
Пабачыш — не гані з абсады,
Дай хоць на гэты дзень спакой,
Павінна ж быць і ў зайца радасць
Перад халоднаю зімой.

Васіль ЖУКОВІЧ

Загадкі

Гальчастыя рогі,
хуткія ногі,
колер поўсці — залаты.
Хто я, ці ведаеш ты?

Да яліны, да сасны
доктар прыляцеў лясны.
Палячыў сасну, яліну
і высокі бор пакінуў,
паляцеў у той лясок,
дзе бярозавы піў сок.

Іголкі па спіне, на шыі...
Ён з імі не расстанецца.
Іголкамі зусім не шые,
аднак жа — карыстаецца.

У ваду нырае смела,
хатку ён будуе ўмела.
Пад вадой і на вадзе
будаўніцтва ён вядзе.

У рыжай разбойніцы
хвост, як мятла.
Ад кары ўцякла —
сляды замяла.

З ялінкі на ялінку,
з галінкі на галінку
скача агеньчык жывы...?
Хто гэта? Знаеце вы?

Даўгавухі, касавокі,
скача без аглядкі
ад ваўка і ад лісіцы...
Хто знайшоў адгадку?

Польска-беларуская крыжаванка № 37

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 33: засек, вечарына, нумар, гібон, кок, ял, конь. Мятла, губок, замок, баран, сыр, гэн, Ян, каваль.

Як цыган дурняў шукаў

(цыганская казка)

Жыла-была на свеце старая цыганка, і быў у яе адзіны сын. І вось настаў час ісці гэтаму хлопцу ў салдаты. Забралі цыгана. Праходзіць год, праходзіць другі. Неяк з'явіўся ў табары незнаёмы цыган, апрануты ў салдацкую форму. Падыходзіць ён да старой цыганкі і кажа:

— Добры дзень, бабуля, я ад твайго сына прыйшоў. Мы з ім разам службу нясём. Мяне ў водпуск адпусцілі. Кланяўся ён табе і прасіў споўніць адну яго просьбу.

Узрадавалася цыганка:

— Ай, дзякуй, сынок, што добрую вестку прынёс. Скажы, што ён прасіў, усё для свайго сына зраблю.

— Жыццё ў нас там, бабуля, несалодкае, кормяць нас слаба, а апранаюць і таго горш. Глядзі, як я абнасіўся.

Глядзіць цыганка: і сапраўды — форма ў салдата зусім кепская.

— Вось і прасіў твой сын, каб ты яму ежы як болей прыслала, ды і вопраткі ўсялякай, і абутку.

Пайшла цыганка ў шацёр, выграбла адтуль усё, што ў яе было і што магло сыну спатрэбіцца, завязала ў хатуль і аддала незнаёмаму цыгану:

— Вазьмі, дарагі, перадай сыну ды пакланіся яму ад мяне.

Пайшоў цыган, а старая нават імені яго не спытала, хто ён, што ён — так і не даведалася.

Праходзіць час. Вяртаецца сын з войска. Зарадавалася маці:

— Ой, сынок, вярнуўся нарэшце. А я ж цябе чакала, чакала, вачэй не заплюшчвала. Тут твой таварыш прыходзіў, вестку ад цябе прынёс, а я яму ежу ды вопратку перадала, усю, што ў цябе была.

Бульбіна

Няма ўжо гаспадаркі ў бабы Мані. Бо наследнікаў няма. Дзеці ў горадзе, самі таксама ўжо немаладыя. А ўнукі яшчэ вучацца. Мабыць, Толік, найменшы ўнучак бабы Мані, хацеў бы, як вырасце, гаспадарыць. Летам прыязджае ў вёску, памагае. Ды якая там гаспадарка! Агарод, куры, свінка ды кароўка. Бабуля аддала сваю зямлю дзяржаве, і пенсію атрымлівае штомесяц, невялікую, але з дапамогай таго агародчыка неяк пражыць можна, на сваім. А ў агародзе — градкі з гароднінай, і загон з бульбай. Памагаў унучак тую бульбу бабулі садзіць вясною. Бабка пасля яе асыпала матычкай, праполвала з лебяды і пырэю... Каларадскага жука разам з Толікам лавілі ў слоікі. „Экалагічная ў нас, бабця, гаспадарка! Здаровыя харчы вырошчваем!" — Толік ужо ведаў, што калі ў зямлю не сыпаць штучнага ўгнаення, а натуральны навоз, і не пасыпаць раслін атрутай ад насякомых ці пустазелля, дык вырашчаныя прадукты больш карысныя для здароўя людзей і жывёл... А маладой бульбы бабуля ўкопвала па кошычку ўжо летам, і скрэб кожную бульбіну Толік ножыкам — у бульбы тады скурачка тоненькая. Смачная, сопкая бульба! А восенню баба Маня запрасіла Толіка з бацькамі — сваім сынам Юлісем і нявесткай Ганяй, сабраць плён з агарода. Бо самой ёй, нядужай, цяжкавата.

Выараў сусед загон бульбы спецыяльным плугам, запрэжаным у адзінага ў вёсцы коніка. Узялі капальнікі кошыкі, пайшлі па разорах, гартаючы матычкамі. Хто цяпер так бульбу капае! Прывыклі трактарнай бульбакапалкай — тады ідзеш сабе па полі ды падбіраеш бульбу, якая выкацілася з зямлі. А дзе ж тут у бабулін агарод трактар упусціш?

Ходзіць па полі Толік, хоць з кошычкам меншым, чым у дарослых, усё ж, падмога лічыцца. Гартае зямлю, пераглядае, ці не схавалася якая бульбіна.... І раптам з-пад зямлі вызірнула вочка! У кожнай бульбіны ёсць вочкі, нават шмат — ды гэта не сапраўдныя вочкі: калі яе пасадзіць, пойдуць з іх карэньчыкі. Ды ў гэтай бульбіны вочка незвычайнае! Быццам бы глядзіць! Разгарнуў Толік зямлю рукамі, дастаў рэдкі экземпляр! Іначай не назавеш! Бульба — птушка! Аграмадная! Дзюбатая ды хвастатая! І на салідных роўных ножках. Шэры папугай! Схаваў Толік бульбу-птаха ў лапухах, і ад радасці ледзь трываў, носячы кошычкі з бульбай у мяшок. А ўвечары пахваліўся знаходкай.

— Гляньце, якое цуда! Ды як яна птушкай зрабілася?

— А ці не хочацца і бульбе палётаць? Усё ў зямлі ды зямлі! — зусім не здзівілася бабуля.

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Беларускі тэатральны калектыў з Беластока

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Паўліна Савіцкая — Гімназія ў Гарадку

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Марыя Мадэйская — II кл. Гімназіі н-р 3 у Бельску-Падляшскім

Жывая вада

Некалі ў вёсцы Сасіны стаяла яшчэ старая царква, каля яе біла крыніца з жывою вадою. Прыходзілі сюды людзі хворыя і храмыя, а калі мыліся жывою вадою, дык адыходзілі здаровымі. Слава аб цудоўнай крыніцы ішла далёка па свеце. Усё больш і больш прыходзіла з розных краёў людзей няшчасных на вылячэнне.

Аднойчы прыйшла аднекуль да крыніцы знатная пані з хворым сабакам. Яна без спросу ў людзей выкупала сабаку ў жывой вадзе.

— Што ты робіш? — абурыліся хворыя і калекі. — Ці ж можна купаць у цудоўнай крыніцы нячыстае стварэнне?

— Мой сабака чысцейшы ад вас, паганых, — фанабэрыста адказала пані.

Ніхто з людзей не пасмеў пярэчыць знатнай пані і яе здаравенным лакеям.

Як толькі панскі сабака вылез з вады, на вачах у людзей берагі крыніцы сышліся, жывая вада знікла.

Стогн жаласці пракаціўся па натоўпе... Пані, прадчуваючы нядобрае, праз момант знікла. Людзі кінуліся ратаваць цудоўную крыніцу. Адкопвалі яе чым хто мог. Капалі і рыдлёўкамі, і рукамі.

Капалі і многа, і доўга. Але не маглі трапіць на яе след. Зямля ўсюды была сухая. Пасмутнелыя людзі разбрыліся па сваіх хатах.

Праз нейкі час на месцы цудадзейнай крыніцы зноў паявілася вада. Але яна ўжо не біла халодным струменем, а кропля за кропляй сачылася, быццам слёзы. Людзі зноў кінуліся да крыніцы. Кропля да кроплі збіралі ваду і шукалі ў ёй ратунку ад сваіх няшчасцяў і хвароб. Але вада больш не лячыла.

Як знікла крыніца з жывою вадою, на вёску пасыпаліся няшчасце за няшчасцем. Ноччу ўвосень невядома ад чаго згарэла старая царква. Людзі ўміралі, як мухі, і некаму было хаваць пакойнікаў. Людзі ўва ўсім абвінавачвалі фанабэрыстую знатную пані з сабакам. Не шукалі яны збавення ў крыніцы. Сцежкі да яе хутка зараслі травой і карчамі, а людзі пачалі забываць месца, дзе некалі біла жывая вада. Крыніца ж не дала забыць аб сабе. Нават тады, калі збожжа на палях жоўкне ад няўмольнай засухі, на месцы крыніцы заўсёды кропля за кропляй сочыцца вада, быццам слёзы па загубленым шчасці.

Жывая кніга прыроды

— Які таварыш, адкуль?

— Ды не ведаю, сынок. Я не спытала.

— Эх, маці, што ж ты так? Ну і дзіўная ты! Не даведалася, хто і адкуль, а ўзяла і аддала дабро першаму сустрэчнаму. Ну нічога, маці, зраблю я так: пайду па белым свеце шукаць, і, калі знайду чалавека дурнейшага за цябе, усё будзе добра, дарую я табе, але калі не знайду такога чалавека, то дахаты не вярнуся. Мне такая неразумная маці не патрэбна.

І пайшоў цыган па белым свеце шукаць чалавека, які б быў дурнейшы за яго маці. Праз нейкі час падыходзіць ён да панскага дома. Бачыць цыган: перад самым домам гуляе свіння з маленькімі парасятамі. Здымае капялюш цыган, становіцца ў гразь на калені і пачынае свінні паклоны адбіваць. У гэты час на ганак пані выходзіць. Глядзіць на цыгана і здзіўляецца:

— Што ж гэта вы, мой мілы, свінні кланяецеся?

— Дарагая пані, у нашай свінні вяселле, наша свіння замуж выходзіць, вось і запрашаю свіней з усёй ваколіцы на вяселле нашай свінні.

І цыган зноў пакланіўся свінні, прымаўляючы:

— Мілая свіння, ужо вы не адмовіце, прыходзьце да нашай свінкі на вяселле.

— Ды перастаньце вы кланяцца свінні ды ўгаворваць яе,— кажа пані, — невялікая асоба, каб ёй кланяцца ў ножкі. Забярыце яе сілай разам з парасятамі, і справе канец.

Забірае цыган свінню з парасятамі, кладзе ў мяшок і пытаецца ў пані:

— А ў чым жа я павязу іх на вяселле?

— Столькі бяды, — адказвае пані. — Забірайце маю карэту і едзьце на здароўе!

Запрэглі цыгану карэту, пагрузілі ў яе свінню з парасятамі, і паехаў ён сам далей. Едзе і думае: аказваецца, на зямлі ёсць людзі дурнейшыя за маю маці.

Вось едзе цыган па дарозе і бачыць: насустрач яму пан скача на вельмі прыгожым кані. Выскачыў цыган з карэты, зняў капялюш і хуценька надзеў на пень, што тырчаў каля дарогі. Пад'язджае пан і кажа:

— Ты што, цыган, робіш?

— Ды вось, — адказвае цыган. — Жар-птушку злавіў. Баюся, як бы яна не ўцякла. Ды мне трэба тэрмінова дамоў заехаць, у бабкі-варажбіткі кніжку чарадзейную ўзяць, каб малітву прачытаць. А то без малітвы яна ў рукі не даецца.

— Слухай, цыган, — кажа пан ,— давай я папільную жар-птушку, а ты садзіся ў карэту і едзь па чарадзейную кніжку.

— Эх, пан, слабы мой конь, ледзь карэту цягне, баюся, пакуль туды даеду ды пакуль назад вярнуся, паляціць жар-птушка.

— А ты вазьмі майго каня, — адказвае пан, — запражы яго ў сваю карэту, дык хутчэй справа будзе. А я пакуль птушку тваю чароўную папільную.

Прыпрог цыган другога каня, павярнуў карэту і памчаўся ў свой табар. А пан сядзеў, сядзеў над капелюшом, чакаў, чакаў цыгана, а таго няма і няма.

— Што такое? — прамармытаў пан. — Куды гэта ён падзеўся? Ну ж я на жар-птушку пагляджу.

Падняў пан капялюш і ўбачыў пень. Плюнуў пан з прыкрасці і паплёўся пяшком на сваю сядзібу.

А цыган прыехаў у свой табар у карэце, запрэжанай парай выдатных коней, ды і свінню з парасятамі з сабой прывёз. Выбягае да яго насустрач маці. А ён ёй і кажа:

— Ну што ж, маці, паездзіў я па белым свеце, пабачыў людзей. Ёсць, аказваецца, на зямлі людзі, дурнейшыя за цябе ў сто разоў. Застаюся жыць з табою, дарую табе. Па дабраце ды па прастаце сваёй ты глупства зрабіла, а яны ад нараджэння дурні!

Дажынкі ў Чыжах

Метэаролагі напужалі нас раптоўным спыненнем доўгатрывалай летняй спёкі і пачаткам асенняй халадэчы ў нядзельны дзень 1 верасня. Але прыгожая сонечная вераснёвая раніца не прадвяшчала раптоўнай змены надвор'я. Жыхары вёскі Чыжы рыхтаваліся да свайго свята — гмінных і адначасова павятовых дажынак. На мерапрыемства з'язджаліся жыхары навакольных вёсак, беларускія мастацкія калектывы з Беласточчыны і Рэспублікі Беларусь, госці. Мясцовыя хоры „Чыжавяне" і „Збучанкі" з прыгожымі дажынкавымі вянкамі спяшаліся ў мясцовую царкву Успення Божай Маці (адзін з большых вясковых храмаў у Польшчы, 569 квадратных метраў паверхні і 33,5 метра вышыні). Тут у 11 гадзін пачалася багаслужба за працавітых сялян Чыжоўскай гміны і ўсяго Гайнаўскага павета. Прыгожая аграмадная царква, пабудаваная на месцы спаленай царквы XVII стагоддзя — помніка старадаўнасці з унікальнымі фрэскамі — запоўнілася вернікамі. Цудоўна спяваў прыхадскі хор, настаяцель прыхода айцец Іаан Раманчук пасвяціў дажынкавыя вянкі і ў пропаведзі на прыгожай беларускай мове (маглі б з яго браць прыклад святары іншых прыходаў) шчыра падзякаваў сялянам за іх працу пры ўборцы ўраджаю ў надта спякотнае лета. Пасля малебна ўсе накіраваліся на пляцоўку з лаўкамі і сцэнай, упрыгожанай вянкамі. На сцэне паявіўся гаспадар гміны — войт Рыгор Мацкевіч, які сардэчна прывітаў прысутных, падзякаваў працавітым сялянам за сабраны плён, а спонсарам за фінансавую дапамогу ў правядзенні дажынак, прывітаў суарганізатараў мерапрыемства — старшыню ГП БГКТ Яна Сычэўскага і сакратара ГП Валянціну Ласкевіч, а таксама гасцей — пасла Сейма Аляксандра Чужа, віцэ-консула Рэспублікі Беларусь Аляксандра Карачуна, віцэ-куратара Альжбету Ціляк, Гайнаўскага старасту Уладзіміра Пятрочука, войтаў суседніх гмін — Яна Добаша з Орлі і Анатоля Паўлоўскага з Дубіч-Царкоўных. Памянуў таксама і мяне, ураджэнца вёскі Мора, што ў Чыжоўскай гміне і Міхася Хмялеўскага, які ў наступным годзе будзе адзначаць пяцідзесяцігоддзе журналісцкай працы.

Канцэрт павяла Валянціна Ласкевіч. Выступілі „Чыжавяне", „Збучанкі", хор „Крыніца" з Беластока, эстрадны калектыў „Сакрэт" з Міхалова, драмгурток з Гарадка з пастаноўкай „Дажынкі" Ніны Ціванюк. Найбольшым поспехам карысталіся госці з Рэспублікі Беларусь: маладзёжны ансамбль танца Вучылішча мастацтваў з Гродна пад кіраўніцтвам Тамары Акаракавай і Беларускі калектыў народнай песні „Церніца" з Мінска. Пасля канцэрта адбыўся абед у школьным будынку.

... і фэст у Бельску-Падляшскім

Да 17 гадзіны амфітэатр у Бельску-Падляшскім запоўніўся да апошняга месца. Фэст адкрыў старшыня Павятовага аддзела БГКТ Васіль Ляшчынскі. Глянуўшы на запоўнены амфітэатр ён сказаў: „Цешуся, што ў Бельску так многа прыхільнікаў беларускай песні і культуры". Да кіравання мастацкай праграмай папрасіў ён Альжбету Фіёнік. Бурмістр Бельска Андрэй Сцепанюк, заклікаючы на сцэну старшыню ГП БГКТ Яна Сычэўскага сцвердзіў, што бельскае беларускае асяроддзе будзе ў далейшым праводзіць такога роду мерапрыемствы разам з ГП БГКТ.

У мастацкай частцы выступілі: хор „Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага, хор БГКТ „Крыніца" з Беластока, эстрадны калектыў „Сакрэт" з Міхалова. З асаблівым зацікаўленнем успрымаліся выступленні мастацкіх калектываў з Рэспублікі Беларусь — маладзёжнага ансамбля танца з Гродна і „Церніцы" з Мінска. Танцоры з Гродна па-мастацку выканалі некалькі беларускіх народных танцаў, што рэдка бачым на фэстах, на якіх выступаюць амаль выключна харавыя калектывы. Мінчане вядомыя ўжо на Беласточчыне. „Церніца" — адзін з лепшых беларускіх мастацкіх калектываў, якія наведваюць наша ваяводства. Усе члены калектыву гэта не толькі дасканалыя спевакі з мілагучнымі галасамі, але таксама і не менш дасканалыя танцоры. Сыходзілі яны са сцэны на абшырную пляцоўку перад амфітэатрам, танцавалі і запрашалі да танцаў гледачоў. Калектыў „Церніца" праспяваў многа беларускіх народных песень у дасканалым сольным і калектыўным выкананні. Усе пункты багатай праграмы ўспрымаліся публікай з асаблівым захапленнем. Варта тут прыгадаць, што іх песні, запісаныя на аўдыёкасетах карысталіся на фэсце вялікім поспехам. На жаль, нельга гэтага сказаць адносна нашых кніжак, якія я і Міхась Хмялеўскі прапанавалі публіцы, седзячы цярпліва за гасцінным столікам.

Віктар Швед

Уцякаючыя гарызонты



Натура ведае праўду,
чалавек — міражы.

Барыс Руско, які паэтычнай творчасцю займаецца дваццаць гадоў, на працягу дзесяці гадоў, а папраўдзе самых апошніх, збірае плён. Быццам бы гэты незвычайны немалады чалавек, са сціслай політэхнічнай адукацыяй і розумам мудраца, якога ў апошні час змагаюць цяжкія хваробы, спяшаўся выказаць сябе і непазнавальнае. Толькі што выйшлі з беластоцкае друкарні дзве кнігі — *Uciekające horyzonty** і каляровая кніжка вершаў для дзяцей (прысвячаная ўнуку Ясю) *Wiersze dla dzieci*. Выдавалі кнігі Б. Руско і дамы культуры, і нацыянальны парк, а цяпер — Цэнтр развіцця індывідуальнасці (ёсць такі — у Беластоку, па. вул. Пястоўскай 13 С, кв. 67.), а рэцэнзіі і ўступныя словы пастаянна піша крытык Вальдэмар Смашч, словы якога ў польскай крытыцы набілітуюць кожнага аўтара і, бывае, даюць пропуск у вядомасць, хай нават у невялікім крузе знаўцаў літаратуры і чытачоў.

Чытачы ведаюць Барыса Руско як паэта пейзажу, красы Белавежскай пушчы. Ды ягоная лірыка не адно апісанне таго хараства. Ён быццам бы акунаецца ў яе ўсёй сваёй істотай, разам з пытаннямі і спробай адказу пра разуменне свету. А прырода — магутны партнёр дыялогу. І, здавалася б, чыстая пейзажная лірыка Б. Руско, а гаворыць пра найважнейшае ў свеце і ў чалавеку.

Колькі ў блакіце
адценняў неба
ведае толькі сонца.
І мастак,
што кідае святло
у прастору карціны.
Прыглядаюся птушкам
як раздрапваюць світанне,
зерне па зярняці,
а я — нелятучы
у блакітным капелюшы
на галаве.
(„Блакіт")

Словы „ключы", характэрныя для гэтага зборніка гэта „світанак", „паміж" і „гарызонт". Світанак — пара *паміж* ноччу і днём, так як і гарызонт — лінія паміж небам і зямлёй. І як мы не ў змозе ўлавіць світанне, такі і не зможам перакрочыць тае лініі кругагляду, якая ўсё аддаляецца. Уцякае. Памятаеце — у маленстве кожнага адным з самых важных пытанняў было: дзе канчаецца кругагляд, што за тою лініяй, як дайсці туды самому, каб праверыць... А як высока тое неба? У розных адценнях блакіту, або чорнае, з завешанымі там зоркамі ды месяцам. Ці яно там, на гарызонце, канчаецца? І, калі дойдзеш, будзеш ведаць, і дакранешся... Гэта як усё чалавечае жыццё — *ад мрої да здзяйснення — дзверы з літага як камень лёсу* („Як дабегчы"). І ляк у чалавеку, які ўваходзіць у жыццё, і лес, вялікі, прыгожы, страшны ў сваёй магутнасці, што кронамі закрывае неба. *У зрэнках/ палае свет./ Дыхаю/ прасторай,/ абрысам пагоркаў,/ стужкай водаў,/ вытанчанасцю раслін./ Цвёрды камень,/ рэзбячы ступак,/ уліваe/ глыток жыцця/ ў вусны.* У той прасторы, у якую трапіў поўнасцю і глыбока чалавек, як у раскрытай кнізе напісанай Богам чытаць не ўмее, а нават штосьці хоча стварацъ, пісаць чалавечымі словамі і разумець чалавечым розумам. Паэт ідзе сваёй дарогай, запісваючы тое, як *ёсць тое, чаго не разумею./ Ёсць толькі тое што адчуваю./ Ёсць штосьці, па чым толькі паўзу./ Ёсць плод, якога не спрабую.* Увекавечаная хвіліна і ўражанне, немагчымыя нават абняць словам, той дзіў боскае праўды, быццам набліжалі той таемны гарызонт.

Міра Лукша

*Borys Russko, *Uciekające horyzonty*, Białowieża 2002, ss. 98.

Маладой карэспандэнтцы Зосі

Малыя справы вялікага значэння

Вітаю нашых дарагіх карэспандэнтаў-ліцэістаў у новым навучальным годзе!

Пару дзён таму падышоў да мяне мой стары сябра Астрон, усунуў у руку ліст і просіць: „Вазьмі ты і адпішы Зосі Лемеш з Гайнаўкі. Вы — бабы і ў бабскай тэматыцы лепш за мяне разбіраецеся. Гэтай дзяўчыне варта нешта падказаць!"

Прачытала я Зосін ліст, у якім яна піша нашаму Астрону: „Справа ў тым, што я хачу вымусіць ад Вас нейкую кансеквенцыю. Вось Вы мяне намовілі, каб я напісала ў „Ніву" нешта „больш сур'ёзнае" і, па-мойму, Вы павінны напісаць, як гэта вам падабаецца. Вы ж перш за ўсё вінаватыя, што я наважылася на такі шалёны крок! Адкажыце мне хаця двума сказамі".

Доўга дзядзька Астрон цягнуў з адказам, пахворвае ён апошнім часам, а цяпер вось узяў і зваліў гэта на мяне. Але мушу прызнацца: раблю гэта з вялікай прыемнасцю, хаця мы ўсе ўжо крыху хворыя. Тым больш радасна, што на змену нам прыходзяць маладыя, здольныя людзі, дзякуючы якім ёсць надзея, што беларускае слова будзе жыць.

У цябе, Зося, ёсць задаткі быць добрай журналісткай. Малыя на першы погляд справы (нават тыя бабскія, пра якія гаварыў дяздзька Астрон), могуць мець таксама вялікае значэнне. Можа нават большае няраз, чым так званыя справы вялікія. Істотна тут, каб ты адчувала іх усім сваім нутром, каб для цябе яны былі найважнейшыя.

Успамінаецца мне казка, якую калісь надрукавала „Зорка". У дзеда і бабы нарадзіўся сынок. Вялікі быў, прыгожанькі. Рос як на дражджах. Дзед і баба глядзелі на яго і цешыліся. Адно не давала ім спакою: хлопец не гаварыў. Бацькі часамі паплаквалі ў куце, але пасля суцішаліся, дзякуючы Богу за тое, што на старыя гады даў ім дзіцятка. Аднойчы ў вёсцы здарыўся пажар. Дзед і баба якраз былі ў полі. Бачаць яны: бяжыць іх сынок. „Тата! Мама! — крычыць ён. — Гарыць!" А дзед і баба не бягуць пажар гасіць, а ўсплеснулі рукамі ды да сыночка: „А Божачкі, дык ты стаў гаварыць?!" А сынок ім адказвае: „Я і раней умеў гаварыць, ды толькі не было нічога такога важнага!" Дык навошта ж было яму пераліваць з пустога ў парожняе, праўда?..

Трэба сказаць, што ты, Зося, умееш выбіраць **важныя** справы. Не чужыя табе дзявочыя справы, але патрапіш рэагаваць і на грамадскія праявы нашага жыцця. Пры гэтым стыль застаецца ў цябе такі ж лёгкі, непрымушаны і ненадуты, быццам бы ты пісала, як зачараваць чарговага хлопца. Малайчына! Так і трэба. Менавіта: пісаць так, каб твае тэксты хацелася чытаць, каб словы ў іх порхалі, як птушкі па дрэвах, спяваючы непаўторную, толькі тваю мелодыю.

Мне падабаецца, што ты нават пачынаеш палемізаваць з журналістамі, а гэта ўжо сведчыць аб спеласці тваіх думак і адвазе. Журналіст павінен пісаць тое, што бачыць нават тады, калі ведае, што нейкая незадаволеная крытыкай „інтэлігентка" можа кінуць табе ў трубку рэдакцыйнага тэлефона: „Манюка!" Нават тады, калі загадзя можаш прадбачыць, што нехта абвергне твае погляды на пэўную справу, заплюе найпрыгажэйшыя праявы нашага жыцця, перакруціць факты, паставіць усё ўверх дном.

Адначасова варта (неабходна!) сачыць за тым, каб нікога беспадстаўна не пакрыўдзіць. Гэта так, як з тым законам: лепш не пакараць вінаватага, чым асудзіць нявіннага. Можна пасля прасіць прабачэння, але нельга яго выпрасіць у самога сябе. І таму, кажу, трэба да журналісцкай справы падыходзіць з вялікай павагай.

Яшчэ раз паўтару: у цябе, Зося, ёсць задаткі быць добрай журналісткай.

Ада Чачуга

На святым паўвостраве Афон (11)

Сярод ікон Божай Маці

У Ватапедскі манастыр прыйшлі мы разам з грэкамі. Манах, які нас сустрэў, папрасіў пачакаць каля брамы і, удакладніўшы па тэлефоне, што ёсць яшчэ свабодныя начлежныя месцы, запрасіў усярэдзіну.

Занеслі мы свае сумкі ў прыгожы пакойчык і пайшлі ў царкву. У Ватапедскім манастыры многа ікон Божай Маці вядомых у Грэцыі і іншых краінах. Спачатку падышлі мы да іконы Багародзіцы „Адказваючая", каля якой Планідзія, дачка візантыйскага імператара, пачула голас, які забараняў ёй уваходу ў царкву. Пасля гэтага здарэння ўведзена была цалкавітая забарона ўязджаць жанчынам на Афон. У ікону Божай Маці „Заколатай" ударыў нажом манах. Многа часу працаваў ён у царкве і часта спазняўся на абеды. Калі аднойчы прыйшоў позна ў сталовую, не атрымаў харчавання. Ад злосці ўваткнуў ён нож у шчаку Багародзіцы, з якой паплыла кроў. Пасля пачаў ён каяцца і маліцца каля іконы і гэтае грэшнае здарэнне было яму дарованае. Пасля яго смерці косці захавалі светлы колер і толькі частка рукі, у якой трымаў ён нож, пачарнела. Зараз на іконе відаць рану і засохлую кроў. Падыходзілі мы да іконы Божай Маці „Расстралянай", змешчанай над манастырскай брамай. У 1822 годзе жаўнер выстраліў у яе і след ад кулі захаваўся па сённяшні дзень. У алтарнай частцы саборнай царквы знаходзіцца ікона Божай Маці „Віматарысы". Паданне гаворыць, што ў час наезду арабаў на Афонскі паўвостраў ікона была схавана ў калодзеж пад алтаром. Калі пазней манахі адкрылі калодзеж, убачылі ікону, якая стаяла на вадзе, а перад ёй гарэла лампада. На жаль, не бачылі мы іконы Багародзіцы „Сказачнай", якую вывезлі з Афона на рэстаўрацыю. У час прыбыцця піратаў на Афон з іконы быў чутны голас, які папярэдзіў манахаў, каб не адкрывалі брамы, а ўваходзілі на муры і бараніліся. Сімвалам усіх афонскіх ікон Божай Маці можна назваць ікону Багародзіцы з жазлом сярод манастыроў Афонскага паўвострава.

Афонская ікона Божай Маці

Ватапедскі манастыр побач Вялікай лаўры і Панцеляймонаўскага манастыра — адзін з самых вялікіх на Афоне. Па важнасці займае ён другое месца пасля Лаўры, а ў даўніх дакументах успамінаюць яго як Ватапедскую лаўру. Згодна з паданнем заснаваны быў ён у канцы IV стагоддзя Феадосіем I. Раскопкі і доследы прывялі да вываду, што манастыр знаходзіцца на месцы, дзе ў мінулым быў язычаскі горад з капішчам Зеўса. У час праўлення імператара Феадосія I на гэтым месцы была пабудавана хрысціянская царква і з пагрозай пакарання смерцю забаронены былі язычаскія рытуалы. Зараз у манастыры знаходзіцца многа старых рукапісаў і дакументаў, з 600 кодэксамі. Побач ікон Божай Маці, святых і часціц астанкаў угоднікаў Божых знаходзяцца ў ім тры часткі пояса Багародзіцы.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Месца ў Верыі, дзе маліўся св. апостал Павел

Пасля нядзельнай Літургіі спяшаліся мы, каб на час даехаць у прыстань Дафні. Пасля поўдня адпраўлялася адтуль судна ў грэцкі горад Уранопалі, адкуль мы прыплылі на Афон. Вяртаючыся з Ватапедскага манастыра можна было апошні раз паглядзець на прыгожыя афонскія краявіды. Ззаду заставаліся манастыры, у якіх мы маліліся і начавалі. Можа будзе яшчэ нагода вярнуцца на Афонскі паўвостраў.

У Салоніках спаткалі нас знаёмыя з Польшчы, якія звазілі нас на машыне ў старыя грэчаскія гарады Суроці і Верыю. Наведалі мы жаночы манастыр Іаана Багаслова каля мясцовасці Суроці. Знаходзяцца ў ім галава святога Арсенія Кападакійскага і закопаныя ў зямлі астанкі манаха Паісія, які жыў і маліўся на Афоне. Апошнія гады свайго жыцця правёў ён у Грэцыі і заснаваў жаночы манастыр (дзе зараз пахаваны), які вылучаецца асаблівым парадкам і чысцінёй. Паломнікі наведваюць магілу бацюшкі Паісія, моляцца каля яе і бяруць з яе пясок. Вядомыя выпадкі аздараўлення пасля малітваў да манаха Паісія. Лічыцца, што ў хуткім часе можа быць ён праслаўлены як святы.

Падмацаваўшыся кавай паехалі мы ў горад Верыю і наведалі месца, дзе з пропаведдзю выступаў апостал Павел. Гэтае месца з іконай св. Паўла спецыяльна выдзеленае і абложанае мармурам. Раз у год адбываюцца там мітрапаліцкія святкаванні. Перад вяртаннем у Салонікі заехалі мы яшчэ ў стары манастыр Іаана Хрысціцеля. Моляцца там толькі некалькі манахаў. Сваім выглядам напамінае ён афонскія манастыры. Нядаўна пачаўся ў ім рамонт галоўнай царквы. У гэтым манастыры, як у большасці на тэрыторыі Грэцыі, манахі моляцца паводле новага стылю. Некаторыя грэцкія прыходы трымаюцца старога стылю, як манастыры на Афоне, але іх нямнога.

У Салоніках наведалі мы яшчэ некаторыя цэрквы. Пасля двухдзённага побыту на тэрыторыі Грэцыі на самалёце, з перасадкай у Будапешце, вярнуліся мы ў Польшчу. Зараз штораз цяжэй наладзіць арганізаваныя паездкі на Афон. Прыватныя асобы могуць на працягу ўсяго года ўязджаць на Афонскі паўвостраў пасля афармлення віз у Салоніках.

Аляксей Мароз

Забытыя Паеўскія

Сёлета спаўняецца 110 гадоў з дня нараджэння забытага беларускага гісторыка, краязнаўца і царкоўнага дзеяча Льва Паеўскага.

Жыццём і творчасцю Льва Паеўскага ў Беларусі ніхто з даследчыкаў грунтоўна не займаўся. Таму звестак пра яго захавалася вельмі мала. Вядома толькі, што пачынаючы з 70-х гадоў XIX стагоддзя вылучаўся ён адукацыяй, эрудыцыяй і імкненнем да навуковай працы.

Нарадзіўся Леў Паеўскі ў Любліне ў беднай сям'і. Закончыў духоўную семінарыю і застаўся ў ёй працаваць выкладчыкам гісторыі. Але з цягам часу ён пакідае педагагічную дзейнасць і пачынае служыць свяшчэннікам. Леў Паеўскі пераязджае на Гродзеншчыну і служыць у праваслаўных прыходах Слоніма, Радома, Янава, Шчытніках і г.д. Жывучы сярод беларускага насельніцтва, гісторык і свяшчэннік Паеўскі заўсёды цікавіўся жыццём беларусаў, а за „небяспечныя" гутаркі з імі быў нават некалькі разоў аштрафаваны.

На Гродзеншчыне гісторык арганізоўвае „падзвіжныя школы" (кожны дзень у іншай хаце), якія карысталіся большай папулярнасцю сярод сялян, чым народныя школы.

Акрамя гэтага Леў Паеўскі пачынае займацца краязнаўствам, вывучаць гісторыю Беларусі. У 1892 годзе ў Гродне выходзіць з друку ягоная грунтоўная праца „Пра цэрквы старажытнай Брэсцкай епархіі, якія ўваходзяць у склад Мельніцкага благачыння ў 1775 годзе. На аснове старажытных візітаў". У ёй аўтар узнімаў пытанне аб пошуках новых гістарычных крыніц па гісторыі Царквы.

Адначасова з-пад пяра гісторыка выходзяць новыя цікавыя гістарычныя і краязнаўчыя працы — „Брэст-Літоўск і яго старажытныя храмы: гістарычны нарыс"(Гродна 1894), „Камянец-Літоўск і яго старажытныя храмы: гістарычны нарыс" (Гродна 1895). У 1893 годзе ў „Працах IX Археалагічнага з'езда ў Вільні" Леў Паеўскі друкуе артыкул „Жыровіцкі і Брэстлітоўскі архівы". За гэтыя і іншыя даследаванні становіцца ён сябрам Маскоўскага археалагічнага таварыства і Увараўскай археалагічнай камісіі. Ён удзельнічае ў чатырох з'ездах Маскоўскага археалагічнага таварыства, выступае з дакладамі і рэфератамі.

У Гродне свет пабачылі яго навуковыя працы „Старажытнае паданне пра Жыровічы і цудатворны вобраз Жыровіцкай Багамаці", „Гістарычны лёс і значэнне заходне-рускіх брацтваў", „Іасафат Кунцэвіч", „Збліжэнне старой Літвы са старажытным Ноўгарадам", „Нашы правінцыяльныя архівы і іх значэнне" і іншыя. Усяго Паеўскім было напісана каля 30 навукова-гістарычных прац. Шмат іх загінула ў агні ў Камянцы пры пажары 1893 года.

Пасля 1897 года Леў Паеўскі вырашыў праводзіць уласныя археалагічныя раскопкі і сур'ёзныя пошукі звестак пра Беларусь у архівах Расіі. Будучы сябрам Увараўскай археалагічнай камісіі, ён у 1904 годзе ездзіў па яе даручэнні ў Цвер, дзе вёў пошукі ў архівах. У Беларусі Леў Паеўскі не толькі шмат даследаваў і пісаў пра яе гісторыю, але спрыяў аднаўленню старажытных архітэктурных помнікаў, у прыватнасці, рэстаўрацыі Белай Вежы ў Камянцы.

Памёр Леў Паеўскі далёка ад Беларусі ў Тбілісі ў 1919 годзе. І калі яго імя да сённяшніх дзён з'яўляецца малавядомым у Беларусі, дык імя яго сына Міхаіла Паеўскага, наадварот, ніколі не будзе забыта праваслаўнымі вернікамі. Таму хочацца крыху нагадаць і пра яго.

Міхаіл Паеўскі (мітрапаліт Мінскі і Беларускі Мелхіседэк) — адзін з самых актыўных дзеячаў Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. Вучыўся Міхаіл Паеўскі спачатку ў манастырскай школе, пасля ў духоўнай семінарыі і ў Казанскай духоўнай акадэміі. Пасля заканчэння акадэміі, у 1904 годзе быў накіраваны ў Магілёў выкладчыкам у мясцовую семінарыю. У Магілёве Паеўскі-малодшы становіцца манахам і яго Свяшчэнны Сінод зацвярджае ігуменам Брацкага Богаяўленскага манастыра. А ў пачатку 1919 года ён атрымлівае прызначэнне ў Мінскую епархію і становіцца епіскапам Слуцкім, вікарыем Мінскім.

У 1922 годзе пры ўдзеле ўсяго беларускага духавенства і вялікай колькасці вернікаў епіскапа Мельхіседэка прызначаюць мітрапалітам Мінскім і Беларускім. Ён, у сваю чаргу, звяртаецца да пастыраў аб неабходнасці вяртання аўтаноміі Беларускай праваслаўнай царкве, якая належала ёй раней. Найперш Мельхіседэк спасылаецца на тое, што беларускі народ вельмі адрозніваецца ад рускага народа, ён мае сваю мову, культуру, традыцыі, а тым больш былі створаны БНР, а пазней і БССР.

Праз год Міхаіла Паеўскага (Мельхіседэка) арыштоўваюць органы ГПУ і саджаюць спачатку ў Бутырскую турму, а пасля адпраўляюць у Сібір. Вызваляюць яго толькі ў 1927 годзе і прызначаюць епіскапам Краснаярскім. У маі 1931 года Мельхіседэк быў выбраны ў Свяшчэнны Сінод РПЦ, але праз некалькі дзён пры нявысветленых абставінах ён памірае. Акрамя маскоўскага духавенства на паховіны ў Маскву прыязджаюць прадстаўнікі Мінскай епархіі.

Такім быў лёс Льва і Міхаіла Паеўскіх. Яны заслугоўваюць не толькі сур'ёзных манаграфій, але і помнікаў, а імя Мельхіседэка пара залічыць да ліку святых Зямлі Беларускай.

Сяргей Чыгрын

У пушчанскай памяці

Нашы гістарычныя веды ўсё яшчэ багатыя прагаламі і няяснасцямі. Наша мінулае патрэбнае не дзеля ўцёкаў ад надзённых спраў, але дзеля лепшага зразумення сённяшніх праблем. Радуе тое, што між нас знаходзяцца шукальнікі нашых гістарычных памятак. Дзякуючы захадам гайнаўскага мастака Віктара Кабаца і грошам пакойнага ўжо прадпрымальніка і настаўніка Казіміра Кубацкага была адроджана і ўшанавана прыгожымі помнікамі гісторыя Студзеньскага паўстання ў Белавежскай пушчы і месцы пакут ад саветаў і немцаў.

Ва ўрочышчы Падцэрква выраслі тры высокія металічныя крыжы. Калісь там стаяў паўстанчы лагер і па сёння захавалася паўстанчая магіла. Памятная табліца згадвае, што з таго месца ў 1937 годзе гарцэры ўзялі зямлю для Капца Касцюшкі ў Кракаве.

Бліжэй Гайнаўкі, ва ўрочышчы Бярозавая Хатка, побач ландшафтнага запаведніка (паўкіламетра ад рэчкі Дубіткі) на паўстанцкіх могілках, дзе калісь стаяў 9-метровы хваёвы крыж, пастаўлены два стальныя крыжы і каменны валун з Давідавай зоркай; гэта адны з буйнейшых паўстанцкіх могілак палякаў, беларусаў і яўрэяў.

Трэцяе ўшанаванае месца знаходзіцца побач вузкакалейкі з Гайнаўкі ў Тапіла, за мастком на рацэ Лясной; там загінуў генерал Язэп Балаховіч. Месца тое знаходзіцца ў глушы і дайсці да яго можна толькі пяшком.

У Тапіле высіцца сяміметровы крыж і прыгожая, экуменічная, з натуральнага бярвення каплічка, прысвечаная леснікам і іх сем'ям, якія загінулі ў 1939-1945 гадах, у іх ліку і 416 сем'ям вывезеным у Сібір.

На Юдзянцы, на ўсходніх акраінах Гайнаўкі, пастаўлены крыж з дзвюх чыгуначных рэек, які ўшаноўвае расстраляных у 1939 годзе васемнаццацерых жыхароў Сямятыч, ларочнікаў. Яны загінулі, бо дагнаныя ў Гайнаўку, не паспелі на ад'язджаючы ў Сібір поезд; на каменным абеліску выпісаны іх прозвішчы. Помнік стаў у 1983 годзе дзякуючы ахвяраванням жыхароў Сямятыч і гайнаўскай каталіцкай парафіі, а патранує яму Пачатковая школа н-р 3 на Юдзянцы.

Дубовыя скульптуры ў памяць сям'і Стажынскіх

На г.зв. Майдане стаяць тры высокія дубовыя скульптуры аўтарства Віктара Кабаца і Тадэвуша Маркевіча, якія ўшаноўваюць расстраляную немцамі сям'ю лекара Стажынскага з Гайнаўкі, у тым ліку немаўля і цяжарную жанчыну.

Міхал Мінцэвіч
Фота аўтара

Маргінальны тэрарызм

Вельмі цікавы і знакаміта, па-майстэрску рэалізаваны рэпартаж паказала рэгіянальнае тэлебачанне ў апошні дзень жніўня. Падрыхтаваная для першай праграмы TVP „Пагоня за праўдай" расказвае аб праследзе журналістаў у Беларусі, абмяжоўванне там свабоды слова і ўрэшце пра няспынную патрэбу несці яго з-за мяжы. Юры Каліна нічога нахабна не каментуе. Толькі далікатна дае знаць, што фінансавыя „сячэнні" заходніх арганізацый для Радыё „Рацыя" ледзь не збегліся з прысудам журналістаў „Пагоні" Міколы Маркевіча і Паўла Мажэйкі ды м.інш. таямнічым знікненнем мінскага аператара ОРТ Дзмітрыя Завадскага, які, да рашэння аб супрацоўніцтве з гэтай маскоўскай тэленстанцыяй, быў фаварызаваны самім Аляксандрам Лукашэнкам. Суразмоўцы Каліны сцвярджаюць, што знікненне карэспандэнта па інспірацыі Лукашэкі мае сувязь са сцвярджэннем Завадскага ў адным з матэрыялаў пра ўдзел беларускіх спецатрадаў у Чачні і выкарыстаннем імі беларускага ружжа. Алег Латышонак, адзін з шэфаў Радыё „Рацыя", гіпатэтычна тлумачыўшы прычыны фінансавых сячэнняў радыёстанцыі, кажа ў рэпартажы Каліны, што гэта можна спалучаць з апошнімі прэзідэнцкімі выбарамі, у якіх, як вядома, выйграў Лукашэнка. З выказвання Латышонка можна зразумець, што Радыё „Рацыя" паводле дысідэнтаў з Захаду не выпаўніла сваіх прапагандысцкіх функцый, не давяло да прымянення ў Беларусі дэмакратычных прынцыпаў, значыць, мела яно замалую сілу ўздзеяння, значыць — грошы ідуць упустую.

Састаўленне факту праследу журналістаў у Беларусі і выкліканых гэтым пратэстамі амаль ува ўсім свеце з рашэннямі наконт Радыё „Рацыя" ясна паказвае, як вельмі маргінальна трактуюцца сярод г.зв. знаці дэмакратычнага свету Захаду беларускія праблемы. Змагары за дэмакратыю ў Беларусі фінансава і маральна прайгрываюць з Афганістанам ці Іракам. Тэрарызм Лукашэнкі, як гэта акрэслівае частка беларускай апазіцыі, здаецца быць нічым у параўнанні з тэрарызмам інспіратараў атакаў на World Trade Center у Нью-Йорку. Наглядныя вынікі тэраразму прэзідэнта Беларусі зводзяцца адно да знікнення (дарэчы, нявысветленага) паасобных журналістаў ці іх сімвалічнага пакарання не на цэлыя гады, а на пару месяцаў работы пад адкрытым небам — маўляў, так думаюць на Захадзе. І, здаецца, на жаль, нічога гэтага погляду не зменіць. Таму добра, што Юры Каліна рэалізаваў „Пагоню за праўдай". Добра, аднак, было б, каб дваццаць хвілін на тое, каб паглядзець гэты рэпартаж, прысвяцілі тыя, хто вырашыў лёс Радыё „Рацыя", а агульнапольскае тэлебачанне такі шанц ім дало.

Мацей Халадоўскі

Чырвоная Армія ў Моры

Пасля прыходу ў 1933 годзе да ўлады ў Нямеччыне Гітлер пастанавіў выправіць крыўды, якія былі ўчынены Нямеччыне альянтамі на мірнай канферэнцыі ў Парыжы ў 1919 годзе. Паспяхова пачаў ён рыхтавацца да вайны, хуткімі тэмпамі ажыццяўляючы ўзбраенне.

У 1936 годзе заняў ён дэмілітарызаваную Рэйнскую правінцыю, у 1938 годзе заняў без бою Аўстрыю і далучыў да Нямеччыны чэшскія Судэты. У 1939 годзе Гітлер пачаў дамагацца ад Польшчы вольнага горада Гданьска і свабоднага праезду праз Памор'е („польскі калідор") у Прусію. У цяжкі для Польшчы час, 6 красавіка 1939 года Польшча і Вялікабрытанія заключылі тымчасовы двухбаковы пакт аб узаемнай дапамозе супраць агрэсіі. Гітлер адрэагаваў на гэты пакт дэнансацыяй польска-нямецкага пакта аб ненападзенні ад 26 студзеня 1934 года.

Савецкім Саюзам рабіліся захады па прадухіленні вайны і нямецкай агрэсіі. У маі і чэрвені 1939 года В. Молатаў звярнуўся да нямецкага пасла ў Маскве Шуленбурга з прапановай унармавання палітычных адносін з Нямеччынай. Гэтыя захады прывялі да падпісання 23 жніўня 1939 года так званага пакта Рыбентроп-Молатаў. На падставе дагавору аб ненападзенні былі вызначаны сферы ўплываў Савецкага Саюза і Нямеччыны ва Усходняй Еўропе.

Гітлер не верыў, што Англія і Францыя выступяць супраць Нямеччыны за Гданьск і „польскі калідор". Нападам на Польшчу 1 верасня 1939 года пачаў ён другую сусветную вайну. Польскі ўрад уступіў у вайну з немцамі не будучы да яе падрыхтаваным. Гітлер забраў не толькі „польскі калідор" і Гданьск, але і ўсю Польшчу.

Раніцай 17 верасня Міністэрства замежных спраў СССР польскаму паслу ў Маскве Вацлаву Гжыбоўскаму ўручыла ноту, у якой сцвярджалася, што ў сувязі з упадкам польскай дзяржавы, усе дамоўленасці паміж СССР і Польшчай становяцца несапраўднымі. У такой сітуацыі Савецкі Саюз загадаў сваёй арміі перайсці польскую граніцу і ўзяць пад сваю пратэкцыю насельніцтва Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

На працягу пару дзён Чырвоная Армія без бою заняла ўсю тэрыторыю Заходняй Беларусі. Трэба сказаць, што савецкія вайскоўцы карэктна ставіліся да мясцовага насельніцтва. Неўзабаве пачала ўсталёўвацца савецкая ўлада, якая занялася пераводам эканомікі на савецкі лад. 2 лістапада 1939 года Заходняя Беларусь была аб'яднана з Беларускай ССР. Аднак ужо 5 снежня 1939 года СНК СССР прыняў пастанову аб высяленні ў Сібір, Казахстан і іншыя аддаленыя раёны краіны асаднікаў, афіцэраў польскай арміі і работнікаў лясной аховы. Вывозілі таксама ў Сібір і „кулацкія" сем'і з ліку беларускага насельніцтва.

Невялікі атрад Чырвонай Арміі затрымаўся таксама і ў маёй вёсцы Мора дзеля „ўтрымання парадку". Салдат размеркавалі па хатах. У нас пасяліўся сімпатычны чырвонаармеец, які ўпадабаў сабе нашу вялікую хлебную печ, з якой высяліў мяне з братам. Набліжаліся асеннія халады і мой бацька сцвердзіў, што каб печ была заўсёды цёплай, трэба прывезці дроў з Белавежскай пушчы. Наш салдат выказаў згоду паехаць з маім бацькам у лес, калі толькі будзе на гэта дазвол яго камандзіра. Дазвол такі мы атрымалі і адправіліся ў пушчу. Мой бацька марыў аб тым, каб да новапабудаванай хаты дабудаваць сені і камору. Таму апрача дроў патрэбныя былі піламатэрыялы. Бацька ўгледзеў сярод сухастою ў пушчы высокую сасну, якую спусцілі з чырвонаармейцам. „Привезли мы с хозяином из леса длинную, длинную палку", — хвастаўся потым савецкі салдат. Нягледзячы на гэта, што бацька мой стаў кульгаць, аднавілася недамаганне прастрэленай падчас першай сусветнай вайны нагі, я пайшоў вучыцца ў новаадкрытую ў Орлі беларускую дзесяцігодку. На нашым школьным пляцы савецкія салдаты ўладкавалі кінаперасоўку і на замацаванай на двух калках прасціны дэманстравалі ўвечары савецкія кінафільмы, якія я, мае школьныя сябры і мясцовае насельніцтва з цікавасцю глядзелі.

Галодны, пасля школьных заняткаў заглядаў я часам у мясцовую сталовую, у якой надта мне смакаваў гарачы, духмяны, упершыню піты рускі чай, якому я нават прысвяціў верш. З прычыны недахопу ў магазінах цукру, савецкія салдаты навучылі нас піць чай з цукеркай-ледзянцом за шчакою, у гэтак званую прыкуску.

Рускі чай

Ніхто калісьці ў вёсцы Мора
Не ведаў чаю — не сакрэт.
Быў нехта ад прастуды хворы —
Піць ліпавы давалі цвет.

Помню, у Орлю, у сталовай,
Са школы выйшаўшы бадай,
Першы раз у жыцці вясковым
Піў смакавіты рускі чай.

І калі перасохне ў горле
У спёку лета, цёплы май,
Прыпомніцца мне піты ў Орлі
Слаўны, духмяны рускі чай.

У 1939 годзе здарылася ў маім жыцці вельмі істотнае. Увесну гэтага ж года ў міжваеннай Польшчы здаваў я ўступныя экзамены ў польскую гімназію ў Бельску-Падляшскім і не быў прыняты з прычыны „недахопу вольных месц". Беларусам тады не было вольных месц у польскіх сярэдніх школах, не гаворачы ўжо аб вышэйшых навучальных установах. Такім чынам былі зачынены перада мною дзверы ўсіх школ і я быў вымушаны вярнуцца ў вёску на гаспадарку.

Восенню 1939 года за савецкай улады ўзнікла на Беласточчыне шырокая сетка беларускіх школ. У Орлі арганізавалася беларуская дзесяцігодка. Я стаў вучнем гэтай школы. Да чэрвеня 1941 года закончыў пяты і шосты класы дзесяцігодкі. Мая „кулацкая сям'я" не паехала на „белыя мядзведзі" толькі з прычыны інвалідасці майго бацькі. Так што былі перспектывы закончыць прынамсі сярэднюю школу, калі б не здарылася нападзенне гітлераўскай Нямеччыны на Савецкі Саюз. Гітлераўская акупацыя на Беласточчыне на тры гады спыніла маю далейшую адукацыю.

Віктар Швед

Левы ўрад б'е па кішэні. Эва Б., самотная матка чатырох дзяцей, у тым аднаго хворага, беспрацоўная, атрымала ў жніўні ад дзяржавы 900 злотых.

Яшчэ адна рэформа

Аліменты атрымлівае спадарыня Эва з Аліментацыйнага фонду. Мае выхаваўчую дапамогу, сямейную, атрымала аднаразовую мацярынскую ўспамогу з сацыяльнай апекі, тэрміновую дапамогу адтуль і пастаянную. Канкубент, бацька тройкі детак, жыве з сям'ёй. Маці спадарыні Б. кажа, што трэба ўмець жыць.

Урад ад верасня ліквідуе Аліментацыйны фонд і дзесяць павіннасцей выплачваных сем'ям. Аліментацыйны фонд выплачваў (праз пасрэдніцтва ЗУС) павіннасць дзіцяці, калі суд вызначыў аліменты, а бацька ці маці іх не плацілі. Грошы з гэтага фонду будуць перададзены на сямейныя ўспамогі, якія будуць належыцца няйбеднейшым сем'ям, у залежнасці ад даходу сям'і і ўзросту дзіцяці. З гэтай павіннасці ў нашым ваяводстве карыстала блольш за 11 тысяч асоб, у сярэднім атрымлівалі яны ў мінулым годзе каля 510 злотых. Цяпер сямейная ўспамога гэта 42,50 злотых. Урад прадказвае, што будзе яна большая, але не перакрочыць 510 зл. Значыць, тыя, хто атрымліваў дапамогу з Фонду, будуць складваць заявы на сямейную ўспамогу, але і страцяць на гэтым фінансава.

Іншай, кранаючай пенсіянераў, справай будзе тое, што ўспамогу на догляд (zasiłek pielęgnacyjny) — 136,64 зл., які належаўся ўсім, хто перакрочыў 75 гадоў жыцця, будуць атрымліваць толькі тыя, у каго сцвердзіцца значную непаўнаспраўнасць. Да таго нельга будзе спалучаць розныя ўспамогі, напрыклад, аліментацыйную з сямейнай ці мацярынскай.

Пасля рэформы маюць застацца толькі тры віды павіннасцей: успамога сямейная, на догляд і ўспамога для салдат пазваных у армію. (лук)

Вер – не вер

Ой, Астронку, прыснілася мне, што я бегаў па нейкім доме. Дом гэты ўвесь дрыжэў, хістаўся. Проста як бы хісткая была ўся канструкцыя. Здаецца, што я ўцякаў ад нечага, бегаў. Трэба прызнацца, такія сны мне сняцца часта.

Вось дабег я да ліфта. Увайшоў у яго. Ліфт едзе наверх. Спачатку паволі, але штораз хутчэй. Быў ён быццам бы прычэплены звонку, як кран, пры дапамозе якога рабочыя возяць, напрыклад, вядро.

Столі ў гэтым ліфце не было. Быў нейкі люк. Я вылецеў на дах. Увесь дрыжэў. Ага, я апынуўся на даху разам з ліфтам. Ён вылецеў разам са мною і кудысьці адляцеў.

Ага, і яшчэ хачу сказаць, што пакуль у мяне не было правоў вадзіцеля машыны, мне часта снілася, што я езджу самаходам. А сэрца проста лупіць у грудзях. Так баюся паліцыі. Яна ж можа мяне злавіць, а ў мяне няма правоў.

А нядаўна мне прыснілася, што мяне цалавала дзяўчына, якая мне заўсёды вельмі падабалася, але мне да яе было вельмі далёка. Такая прыгожая, недаступная. Поўна хлопцаў вакол яе заўсёды. Пра яе можна было толькі марыць. А тут стаяў я ля сцяны, а яна падышла да мяне і шукае мае губы. Пасля знайшла, прытулілася да мяне і моцна пацалавала мяне два разы.

Што мае сны могуць абазначаць?

Андрушка

Эх, Андрушка, мучаць цябе нейкія няпэўныя і, трэба праўду сказаць, нялёгкія справы. Тое падарожжа ліфтам наверх гаворыць пра цяжкасці ў тваім жыцці. Ты ўцякаў ад нечага, а гэта сведчыла б пра нейкае небяспечнае падарожжа. За гэта гаворыць і дом з няпэўнай канструкцыяй, які хістаўся і дрыжэў. Праследуе цябе ўвесь час непакой, трывога.

І не разлічвай на радасць з прычыны таго, што цудоўная дзяўчына цябе пацалавала. Гэта, наадварот, сведчыць аб тым, што ёсць у цябе фальшывыя сябры, на якіх не разлічвай.

Астрон

Пажарніцкі выбарчы камітэт

1 верасня ў Нарве засядала Гміннае праўленне Добраахвотных пажарных каманд, якому старшынюе Мікалай Ходак. Галоўнай тэмай павесткі дня былі самаўрадавыя выбары. У выніку нарадаў быў створаны Выбарчы камітэт „Пажарнік 2002", а яго ўпаўнаважаным стаў сакратар праўлення Пятро Паўлоўскі.

Гміннае параўленне выказала сардэчную падзяку пажарнікам з вёскі Бялкі — Яну Андраюку, Сцяпану Семенюку, Мікалаю Семенюку, Мікалаю Емельянюку, Андрэю Трафімюку, Аляксандру Нікіцюку, Віктару Міранюку і Віктару Краўчуку — за ачыстку вясковага пажарнага басейна.

На канец пажарнікі звярнуліся да жыхароў гміны з заклікам не выпальваць сухіх траў на палях і сенажацях, што ў цяперашняе засушлівае надвор'е пагражае пажарам.

Мікалай Лук'янюк

Раскапанае Міхалова

У Міхалове кладуць цяпер новыя тратуары, пракладаюць водаправоды. Улетку тратуары з'явіліся ў вёсках Тапаляны, Масціска і Юшкаў Груд. Простым вокам відаць, што гмінныя ўлады стараюцца здабыць сабе прыхільнасць выбаршчыкаў перад кастрычніцкімі самаўрадавымі выбарамі.

Аднак не хапіла грошай на дарогу з Міхалова ў Падазераны, а там і ў Ялоўку. На маю думку, тратуары па вёсках не такая ўжо тэрміновая справа. На першым плане павінна быць будова дарог. Можа новы войт аб гэтым падумае?

Дзядзька Захар

Канікулы з кніжкамі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Кіраўнік Валянціна Валясюк (стаіць) і Крыстына Вашак рады новым памяшканням

У гэтым годзе многа гайнаўскіх вучняў засталося адпачываць у горадзе. Карысталіся яны ў час канікулаў кніжкамі і займаліся ў чытальнай зале аддзялення для дзяцей і моладзі, якое існуе пры Гарадской публічнай бібліятэцы ў Гайнаўцы. Яны гулялі таксама з камп'ютэрам. Працаўнікі бібліятэкі арганізавалі конкурсы для чытачоў і гульні, у час якіх правяраліся веды па арфаграфіі. Аддзяленне для дзяцей і моладзі ў гэтым годзе перанесянае было ў новыя памяшканні з асобным уваходам.

— Мы вельмі цешымся, што гайнаўскія дзеткі і моладзь прыходзяць за кніжкамі ў новыя памяшканні і працуюць у прыгожым чытальным зале, — заявіла кіраўнік аддзялення Валянціна Валясюк. — Раней нашы пакоі былі пераходнымі ў чытальны зал для дарослых і гэта перашкаджала. У новым памяшканні больш месца для працы ў чытальнай зале і лепшы доступ да кнігазбору.

У аддзяленні для дзяцей і моладзі знаходзіцца каля 22 тысячы кніжак, а карыстаецца імі каля 2 тысяч чытачоў. У чытальнай зале можна пры дапамозе камп'ютэра карыстацца мультымедыйнымі праграмамі для дзяцей і моладзі.

— На жаль, мала ў нас кніжак на беларускай мове. Думаю, што можа ў бліжэйшы час купім іх больш. Я сама ведаю беларускую мову, бо ў Падставовай школе ў Курашаве амаль усім прадметам вучылася на роднай мове і хацелася б, каб гайнаўскія дзеткі навучыліся чытаць па-беларуску, — кажа кіраўнік Валянціна Валясюк.

Ад многіх гадоў Аддзяленне для дзяцей і моладзі Гарадской бібліятэкі пастаянна займаецца прапагандаваннем чытання кніжак. Раней Валянціна Валясюк, Крыстына Вашак і Ева Баратынская арганізавалі конкурсы для вучняў падставовых школ і гімназій звязаныя з ведамі аб рэгіёне, на найбольш актыўнага чытача і праводзілі літаратурныя віктарыны. Наладжвалі ў бібліятэцы сустрэчы з вядомымі асобамі, запрашалі акцёраў Лялечнага тэатра з Беластока, а ў мінулым годзе арганізавалі чытанне тэкстаў уголас і збіралі ад чытачоў кніжкі, якія пасля дорылі дзецям.

— Нішто не заступіць добрай кніжкі і мы лічым, што зацікаўленне кніжкай у нашым асяроддзі будзе, — заяўляе спадарыня Валянціна Валясюк.

Аляксей Мароз

Памылку не лічу фальшам

Прымаўкі — народная мудрасць. Рускія кажуць: „Напишешь пером, не вырубишь топором". У 22 нумары „Нівы" ў допісе „Тры пакаленні" я напісаў, што ў Вітаве праклалі асфальтнае палатно. На несапраўднасць гэтай інфармацыі першы звярнуў увагу Сцяпан Мруг, а пазней Мікалай Панфілюк. Праверыў я запіскі, якія рабіў у час размовы з Вадзімам Федаруком 20 сакавіка г.г. Наблытаў я, значыцца. Напісаў няпраўду. Дагэтуль не ўцямлю, як мог дапусціць такую памылку. Прызнаюся шчыра, што такая недарэчнасць здарылася мне ўпершыню за перыяд больш саракагадовага супрацоўніцтва з рэдакцыяй. Сорам цярплю велькі. Таму прашу прабачэння ў шаноўных чытачоў, як і ў паважанай рэдакцыі. Ад віны не адказваюся. Наварыў капусты, дык і з'есці яе мушу. Хачу адзначыць, што асноўным суддзёй будзе маё сумленне і з ім буду змагацца да апошніх дзён.

Мікалай Панфілюк у рэпліцы „Цуд Сідарука" („Ніва" № 34 ад 25 жніўня 2002 г.) прыгадвае, як у пачатку 60-х гадоў адзін карэспандэнт напісаў у „Ніву", што ў вёсцы Е. ёсць электрычнае святло, а ў сапраўднасці яго яшчэ не было і за тую памылку рэдакцыя адхіліла яго допісы на два гады. Хачу ў тым месцы ўдакладніць, што згаданы карэспандэнт учыніў творчае злачынства (так называюць гэта літаратары): зрабіў плягіят тэксту раней друкаванага ў „Ніве", змяніў толькі назву мясцовасці і падпісаў допіс сваім прозвішчам. Няўжо паважаны калега не разбіраецца ў памылках? Памылку нельга лічыць фальшам.

Не ведаю, як далей складзецца мой карэспандэнцкі лёс. Дзякую тым чытачам, якія чыталі мяне і давяралі. Хачу запэўніць, што, калі рэдакцыя дазволіць на далейшае супрацоўніцтва, дык гэты давер апраўдаю.

Уладзімір Сідарук

Ад рэдакцыі: Каянні прымаем. Спадзяемся, што такой памылкі больш не дапусціце.

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl* альбо: *niva_bielastok@skrzynka.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2002 r. upływa 5 września 2002 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2002 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Ну і маем Беласточчыну — гіганцкае лецішча з адметнай архітэктурай і людзьмі як жывымі аздобамі яе

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

Гутараць два сябры:

— Абажаю Балатон і Чорнае мора — я ўдзячны ім найлепшыя дні майго жыцця.

— Дык ты ж там ніколі не быў, адно твая жонка там адпачывала...

— Менавіта таму!

* * *

— Пакажы мне здымкі сваіх блізнят.

— Калі ласка; глядзі.

— Дык тут жа толькі адзін...

— І хопіць! Другі — дакладна такі ж.

* * *

— Верачка, адкуль у цябе заўсёды грошы? Твой муж жа такі скупы...

— Калі хачу сабе нешта купіць, тады ўшчынаю сварку. Паведамляю яму, што кідаю яго і вяртаюся да мамы ў Парцава. Тады ён выдзяляе мне грошы на білет у Бельск, а далей, кажа, ідзі сабе пяшком.

* * *

— Мой муж вельмі мудры! Калі мы на скачках, ён заўсёды ведае, каторы конь прыбяжыць першы, а пасля забегаў — чаму прайграў.

* * *

Мішка прагульваецца з сынам у парку, сустракае іх Андрэй:

— Ну і сын удаўся ў бацьку: вочы, носік, роцік — усё як у цябе! А так, пры нагодзе: ці можаш мне пазычыць тысячу да першага?

— Не магу, — стрымана адказвае Міхась. — А гэтае дзіця з'яўляецца сынам маёй жонкі ад першага яе мужа.

Крыжаванка



Гарызантальна: 2. дах у форме паўшар'я, 4. дачка караля, 6. першы, асноўны гук гамы, 7. сфера, галіна дзейнасці, 9. лісцевае дрэва сямейства вязавых, 11. мноства матэрыяльных каштоўнасцей, 12. гліняны духавы музычны інструмент, 13. адміністрацыйны цэнтр французскага дэпартамента Кальвадас, 15 адміністрацыйная адзінка ў Манголіі, 17. Карл, нямецкі псіхолаг (1879-1963), 18. паэтычная назва Шатландыі, 19. рака і гмінны цэнтр у Сакольскім павеце.

Вертыкальна: 1. пакой для спання, 2. тканіна з кручаных нітак, заменнік скуры, 3. валодае левай рукой лепш, чым правай, 4. паўднёваамерыканскі кажан (*Desmodontidae*), 5. краіна з Мельбурнам, 6. перапрацоўвае нектар на мёд, 8. грамадская годнасць, 9. стагоддзе, 10. Тамаш, віленскі філамат (1796-1855), 14. астранамічная прылада для вызначэння вуглоў, 16. літаратурнае прозвішча Канстанціна Міцкевіча, 17. еўрапейская назва будыйскага духоўнага.

(Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 31 нумара

Гарызантальна: азбука, абрыкос, узрост, абмотка, Нагана, натура, Легніца, дышаль, Бандары, пагада.

Вертыкальна: махаон, прымат, скутэр, Асуан, бераг, кесон, ангіна, асілак, аварыя, ажына, увага, Альба.

Рашэнне: **Хітры жыве коштам дурнога**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Генетычнае страшыдла

Калісь фірма Калген, якая вырасціла памідоры Флаўр Саўр, зрабіла такую рэкламу, дзеля лепшага продажу: „Прадукт ператвораны метадам генетычнай інжынерыі”. Цяпер вытворцы харчоў, дзе прымяняюцца генетычныя змены, прымушаны гэткім чынам асцерагаць спажыўца. А мая Агата дык увогуле не чытае брашур і бірак, купляе на вока — чым прыгажэйшая ўпакоўка, чым больш што хваляць сяброўкі ды медыя, тым ахвотней выдае на тое, бывае, і немалыя грошы. Два альбо тры ў адным — каб было вялікае, як гарбуз, будучы памідорам — смакавала як трускалка, а ў час росту не глушыла яго зелле ды не чапалі насякомыя, не сохла ў траспарце, не вяла ў складах, і каб скурка блішчэла, як наваскаваная, бы з карча толькі што знялі той плод, хоць два гады ўжо прайшло, як тое прывезлі з заморскага краю... І морква, і баклажаны, і бульба, і кукуруза... Генетычна найбольш перарабляюць, вось, рапс, лён, сою, бавоўну, цукровыя буракі, яблыкі, агуркі, трускалкі, сланечнік і тытунь. Вядома, не спажываеш непасрэдна цукровы бурак ці бавоўну... І мала што ясі — і касметыкай карыстаешся, і цела звяроў кормленых генетычнымі страшыдламі спажываеш... Зрабіў я Агаце даклад — падрыхтаваў кіпу выразкаў з газет, кнігі, брашуры. А яна смяецца: „Разумнейшыя ад цябе гэта ўсё выдумалі. А падумай ты пра галадаючую Афрыку! Такі гарбуз на паўвёскі! З аднаго палетка кукурузы — усё племя бліны пячэ! Або такі памідор з прывіўкай ад шаленства ці Альцгеймера! Расце сабе на градцы такое лякарства, з'еў яго — і здаровы!”

Захапленне Агаты такімі харчамі магло мяне толькі раздражняць. Ну, бо што вы думаеце — а раптам пасля кукурузнай кашкі з маслам пачне мяне мутаваць?! І або што вырасце на мне, або адпадзе? Або што благое з Агатай стане? Вырастуць маёй кабеціне, не дай Бог, вусы? Або што яшчэ горшае!..

Стаў я асцерагацца з ежай. Наварыць Агата есці — я спачатку пашныру ў буфеце, пашукаю ўпаковак, прачытаю, што там усярэдзіне... Ды Агата схітрылася: выкарыстае торбачку, і ў сметніцу. Нашто мне чытаць, што з чаго зроблена. Дык я ў сметніцу... Ага, зробленае ў Польшчы... Навучыўся адчытваць усе значкі ды крыптанімы, дзе які кансервант, дзе рабілі штосьці генетычна... Бы не было іншых праблем у свеце — войны, землятрусы, паводкі на поўдні Еўропы, пажары на Украіне, у нас засуха, у Амерыцы час ідзе надта хутка ад верасня да верасня... А я і не піў бы, і не еў бы... Абы здаравейшым памерці. А на тое ж тая мадыфікацыя, каб людзей было менш галодных, і каб фірмы зарабілі.

Аднойчы ранкам паднесла мне да ложка мая каханая палова снеданне. На спецыяльным столічку паставіла, быццам бы за часоў нашага маладога сужонскага кахання. Булачкі ўрацлаўскія, хрусткія, масла з Замбрава, джэм Агацінага вырабу з нашых яблык, шыначкі лісточкаў пару з Макаўкі... Еш, каханы, не бойся... А што гэта такое?!

— Выраслі мне вушы, Ванюша. І шэрсцю ногі абраслі...

Я аж заглянуў Агаце пад халат. Дзе там! Гладкія! Нават тых пару шарсцінак ці то выбрыла, ці то вырвала. І вушэй ніякіх няма пад Агацінымі кудзеркамі, толькі яе ўласныя.

— Прысніўся мне, Вань, страшны сон. Пашмаравалася крэмам з трансгенетычнай вавёркі. І, вось, бачыш...

— Нічога не бачу... Усё добра, Агатка. Дзякуй за сняданак.

І бух сваю каханую ў вішнёвыя губкі.

Вандал АРЛЯНСКІ

А мы ваўка не баімся

Перад чарговым уселясным вярхоўным сходам мядзведзь Сандар Жоржавіч нервова пахаджваў па паляне. Ад ягоных дум на кіламетр трэскаліся падсушаныя яловыя галінкі. Лань Гаўрусіха, як заўжды, прыйшла зарана. Радасна ўскочыла на паляну, ды ўбачыўшы надзьмутага Жоржавіча, адступілася за найбліжэйшую вольху, пад дупло вавёркі Кацюшы.

— А што ж там робіцца? — кінула, спалоханая, „Рудой” (так вавёрку называлі сябры).

— Та-а-а, та-аго не ведаю, — прамармытала вавёрка, агрызаючы чарговы арэх. — Штосьці мне здаецца, што мядзведзь адчуў благія вятры. Учора, падвечар, выс-сандзіравала я з грукату дзятла С-с-стукача, што пасланцы з Уладзіміраўскага лесу запрасілі ўтаптаных у мох змяю Ссапію і вужа Ззянона на гась-сьсціну пры сонейка першым праменні да ваўка Нятупіна.

— А ёйку-ёйку! А нашто ж гэта, нашто?! — дрыжыкі прабеглі па спіне лані. Папраўдзе, гэта былі не дрыжыкі, а мурашкі-альхашкі. Гаўрусіха, усхваляваная, нават і не заўважыла, як, адступаючы, уступілася ў мурашнік.

— Ну, чуеш, Нятупін, кажуць, пакрыўдзіўся на тое, што Жоржавіч на яго пакрыўдзіўся... за тое, што толькі ён мае права крыўдзіцца, — шэптам вылусквала словы вавёрка, адплёўваючы што і раз шалупінне арэха.

— Значыць, хто, і на каго? — не магла ўцяміць лань.

— Наш на таго, а той — на нашага.

— Ага, — урэшце зразумела Гаўрусіха. — Ну, і што ж то будзе?

— Пабачым.

Якраз у гэты момант азваўся мядзведжы рык. Пачаўся сход.

— Гы-ыгм... — пачаў Жоржавіч і змоўк.

Нават дзік Свіналыч знерухомеў. У цішы чуваць было дзіўны лопат. А гэта толькі вушы спалоханага зайца Генадзя трапяталі быццам кляновыя сцягі ва ўселясное свята.

— Гэта, што я вам цяпер скажу — абсалютна сакрэтна. Нятупін хоча мяне выставіць. Па ўзлесках свайго лесу вядзе перамовы са змяёй Ссапіяй і вужом Ззянонам. Разлічваю на вашу лаяльнасць, як назначаных мною прадстаўнікоў нашага звярынца. Тым часам усе падамося ў адпачынак. Ведаеце, „змены ў клімаце, не можам даць сябе падысці”, і гэтак далей.

Генікава лапатанне сціхла. Усе падціснулі хвасты пад сябе. Толькі Стукач не падціснуў — не меў як.

— Можаце ісці ў лес, — лагодна загадаў Жоржавіч. — Вы, дзяцел, астаньцеся.

— Так, — коратка сказаў Стукач.

— Падрыхтуйце мне футру-невідзімку. І самі гатовы будзьце. Паляціце са мною.

— Ды куды ж? — асмеліўся спытацца дзяцел.

— Выберамся наведаць месца за гарамі, на пустыні цьмяналікіх. Трэба масціць рэзервную бярлогу.

— Даруйце, ды як мне там будзе стукацца?

— Я вам там афармлю, што трэба. Тыгр Садзік — мой даўжнік. Хто яму ў час патрэбны безмясную падлу падкідаў, га? Ужо не памятаеце? Усё добра будзе. Дарэчы, выбіраемся толькі на пару дзён, каб усё разведаць. Грунт, каб Нятупін нічога не ведаў.

Жоржавіч па-сяброўску паляпаў Стукача па дзюбе. Аддыхаўся і стаў падпяваць старалясную мядзведжую песню: „Хай з болю енчыць ранны воўк, а я ў гаях бывалы, мядзведзь вам па каплеху шчоўк, усе пра мяне аналы”.

МакХОЛАД

ISSN 0546-1960